30-ты ДЗЕНЬ МЕСЯЧНІКА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ І САМАПРАВЕР

Пралетары ўсіх краёў, аднаўчайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАННЯ—XV
№ 225 4130)
ЧАЦЬВЕР 20 жніўня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

НЕ ЗАЦЯГВАЦЬ ІЛЬНАЎБОРКІ!

ЛЕН ПАЧЫНАЕ ПЕРАСЬПЯВАЦІ

Павінна быць убрана 82.000 га, фактычна ўбрана толькі 65.585

Апартуністы з Дрысенскага раёну чакаюць завозу машын і не арганізуюць РУЧНОЙ УБОРКІ ІЛЬНУ

МАБІЛІЗАВАЦЬ УСІХ ПРАЦАЗДОЛЬНЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ І МОЛАДЗЬ НА ЦЕРАБЛЕНЬНЕ!

Вышэй тэмпы ільнаўборкі!

Ад пачатку ільнаўборачнай у БССР ужо фактычна прайшлі ТРЫ ПЯЦІДНЕЎКІ. Столькі-ж ЗАСТАЛОСЯ ДА КАНТРОЛЬНАГА ТЭРМІНУ СКАНЧЭННЯ ГЭТАЙ КАМПАНІІ. Мы, такім чынам, уступілі ў рашаючы этап ільнаўборачнай.

НА 15 ЖНІЎНЯ з 239.375 гэктараў ільнапасеваў па калгасах і індывідуальным сэктары ЎБРАНА 65.585 ГЭКТ. — 27,4 ПРОЦ. ПАВІННА-Ж БЫЦЬ УБРАНА НЯ МЕНШ 38 ПРОЦ. ільнапасеваў. СТАЛА БЫЦЬ ПАТРЭБНЫЯ НАМ ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ ІЛЬНАЎБОРКІ ЎСЁ ЯШЧЭ НЯ ЎЗЯТЫ. Уборка ільну ў разгары, але Ў БОЛЬШАСЬЦІ РАЁНАЎ ЯНА НЕ ПАСТАЎЛЕНА Ў ЦЭНТР УВАГІ калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Між тым, ЛЁН АМАЛЬ УСЮЦЫ ЎЖО ПАСЬПЕЎ. У РАДЗЕ МЕСЦ ЁН УЖО ПЕРАСТАЙВАЕЦЦА, ШТО ЛАГРАЖАЕ ВЯЛІКІМІ СТРАТАМІ ЎРАДЖАЮ.

АСАБЛІВА АДСТАЮЦЬ РАЁНЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЗОНЫ, у склад якіх уваходзяць шмат ільнаводчых раёнаў. Цэнтральная зона ў 90.185 ГЭКТАРАЎ ільну ЎБРАЛА ТОЛЬКІ 20.105 ГЭКТ. — 22,3 ПРОЦ. На 15-га жніўня яна ПАВІННА БЫЛА ДАЦЬ МІНІМУМ 35 ПРОЦ.

РАЁНЫ ПАЎНОЧНАЙ ЗОНЫ з 99.451 гэкт. ільну ЎБРАЛІ ўсяго 18.607 гэкт.— 18,7 ПРОЦ. Паўночная-ж зона ПАВІННА БЫЛА УБРАЦЬ 33 ПРОЦ. ільнапасеваў.

МТС БССР выканалі ТОЛЬКІ 20,7 ПРОЦ. ПЛЯНУ ІЛЬНАЎБОРАЧНАЙ, у той час, як па рэспубліцы ў цэлым убрана 27,4 проц. ільнапасеваў.

Зусім недапушчальныя адносіны да ільнаўборачнай праяўляе цэлая група важнейшых ільнаводчых раёнаў, дзе і ў трэцюю пяцідзённую яшчэ ня было разгорнута цераблеьне ільну. КІРУЮЧЫЯ І ЗЯМЕЛЬНА-КАЛГАСНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ГЭТЫХ РАЁНАЎ ПРАЯВІЛІ ПРОСТУЮ АПАРТУНІСТЫЧНУЮ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ, АБУРАЮЧАЕ ІГНАРАВАНЬНЕ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ аб разгортваньні ільнаўборачнай. ДРЫСЕНСКІ раён, напрыклад, убраў 0,9 проц. ільнапасеваў, ПОЛАЦКІ — 1,8 проц., БЕШАНКОВІЦКІ — 2,3 проц., ВІЦЕБСКІ — 3,9 проц. і КРУПСКІ — 5,5 проц.. На многім лепш і ў МСЬЦІСЛАЎСКІМ раёне, які выканаў усяго толькі 10,9 проц. пляну, у ТАЛОЧЫНСКІМ — 15 проц. пляну і г. д.

Такое становішча ня мае ніякага апраўдання. Здолелі-ж перадавыя раёны БССР па-бальшавіцку разгарнуць рашучую барацьбу за датэрміновую і пасьпяховую ўборку ільну.

Так, ПЕРАДАВІКАМІ, ЗМАГАРАМІ ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ ІЛЬНАВОДСТВА ЎЖО ВЫЯВІЛІ СЯБЕ: ШКЛОЎСКІ раён — убраў 3.600 гэкт. — 45,7 проц., СУРАСКІ — 3.112 гэкт. — 43,3 проц., ЧАВУСКІ — 2.330 гэкт. — 50,8 проц., ЧАШНІЦКІ — 2.264 гэкт. — 47,9 проц. і ЛЁЗЬНЯНСКІ — 39,5 проц. (гэта лічба паведамлена нам па тэлеграфу Лёзьнянскім райвы). МНОГІЯ КАЛГАСЫ ШКЛОЎСКАГА, ЛЁЗЬНЯНСКАГА І ІНШЫХ РАЁНАЎ УЖО СКОНЧЫЛІ ЦЕРАБЛЕНЬНЕ ІЛЬНУ. РАД КАЛГАСАЎ ЛЁЗЬНЯНШЧЫНЫ І ШКЛОЎШЧЫНЫ АБМАЛАЦІЛІ І ЎЖО ЗДАЛІ ЛЁН. Завяршаюць ільнаўборку паўднёвыя раёны: БРАГІНСКІ (09,7 проц.), ЛЕЛЬЧЫЦКІ (91 проц.), РЭЧЫЦКІ (94,5 проц.).

Такіх бліскучых вынікаў перадавыя раёны і калгасы дасягнулі дзякуючы САПРАЎДНАЙ МАБІЛІЗАЦЫІ МАС НА БАРАЦЬБУ ЗА ЛЁН, НА АСНОВЕ РАЗГОРНУТАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА АРГАНІЗАЦЫЮ ПРАЦЫ І ПРАВІЛЬНУЮ РАССТАНОЎКУ СІЛ. Шклоўскі і Лёзьнянскі раёны прыступілі да ільнаўборкі з вялізарнымі прарывамі ў падрыхтоўцы да гэтай адказнейшай кампаніі. Але ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ГЭТЫХ РАЁНАЎ, неадкладна рэагуючы на сыгналы друку, ЗДОЛЕЛІ МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЕ СІЛЫ на выпраўленьне недахопаў і памылак. У цэнтр увагі тут былі пастаўлены пытаньні сапраўднай зьдзельшчыны, нападжваньня ўліку працы, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Укараненьнем зьдзельшчыны і правільнай расстаноўкай сіл тут АДКАЗАЛІ НА ШКОДНІЦКУЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ КУЛАКА, які імкнуўся сарваць пасьпяховае разгортваньне ільнаўборкі.

Адставаньне ільнаўборачнай па БССР тлумачыцца тым, што ЗНАЧНАЯ ГРУПА РАЁНАЎ ЯНА ЎЛІЧЫЛА НОВЫХ УМОЎ ГЭТАГА ГОДУ, калі з 239.375 гэкт. усіх ільнапасеваў на долю калгаснага сэктару прыпадае 107,603 гэкт. У гэтых умовах ВЫКЛЮЧНУЮ ЎВАГУ НАБЫЛІ ПЫТАНЬНІ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА ЗАМАЦАВАНЬНЯ ІЛЬНАВОДЧЫХ КАЛГАСАЎ.

Партыйныя і зямельна-калгасныя арганізацыі многіх раёнаў ня ўлічылі новых задач, новай абстаноўкі і не прынялі своечасова належных мер да замацаваньня ільнаводчых калгасаў.

Яркім прыкладам зьяўляецца РАСОНСКІ раён, дзе ігнараваньне дырэктыў партыі аб замацаваньні калгасаў прывяло да вялізарных прарываў на фронце ільнаўборкі.

Кліматычныя ўмовы апошніх некалькіх дзён на спрялі ільнаўборачнай кампаніі. Дажджы ў першыя дні чацьвёртай пяцідзённі жніўня бясспрэчна затрымалі работу на палёх. ПРАРЫВЫ Ў РАНЕЙШЫЯ ПЯЦІДНЕЎКІ І ЗАМАРУДЖВАНЬНЕ ТЭМПАЎ У СУВЯЗІ З ДАЖДЖАМІ Ў АПОШНІЯ ДНІ АБАВЯЗВАЮЦЬ КРУТА ЎЗЬНЯЦЬ ЎВЕРХ КРЫВУЮ ІЛЬНАЎБОРАЧНАЙ, КАБ ГЭТЫЯ ПРАРЫВЫ ЗАРАЗ-ЖА ЛІКВІДАВАЦЬ І СВАЯЧАСОВА — ДА 1 ВЕРАСЬНЯ СКОНЧЫЦЬ ЦЕРАБЛЕНЬНЕ ІЛЬНУ.

МТС ПАВІННЫ ЗАРАЗ-ЖА ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА ІЛЬНАЎБОРАЧНАЙ. Яны абавязаны выйсьці на перадавыя пазыцыі фронту ільнаўборкі. Калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, павінны паказаць узор арганізаванасьці, зьдзельшчыны, уліку працы.

Партыйныя арганізацыі павінны арганізаваць апэрацыйнае кіраўніцтва ўборкай ільну. МЕСЦА КОЖНАГА ВЯСКОВАГА КАМУНІСТА І КАМСАМОЛЬЦА — НА ІЛЬНЯНЫМ ПОЛІ, У БРЫГАДЗЕ ІЛЬНАЦЕРАБІЛЬШЧЫКАЎ. Камуністы і камсамольцы павінны стаць на чале ўдарніцтва на ільнаўборцы. Самая РАШУЧАЯ БАРАЦЬБА павінна быць абясшчана ФАРМАЛЬНАЙ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЕ, АБЯЗЬЛІЧЫЦЬ, УРАЎНІЛАЎЦЫ Ў РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ ДАХОДАЎ І АВАНСАЎ, — г. зн. тым мэтадам падрыўной работы, пры дапамозе якой кулак імкнецца сарваць ільнаўборачную, падарваць разьвіцьцё сацыялістычнага ільнаводзтва. САМЫ ЖОРСТКІ АДПОР ТРЭБА ДАЦЬ АПАРТУНІСТАМ, якія значнына ігнаруюць дырэктывы партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў, не жадаюць арганізоўваць масы на штурм ільну.

Неабходна асобна спыніцца на ходзе ўборкі ільну Ў ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ. Ня гледзячы на тое, што аднаасобны сэктар яшчэ сёлета грае вялікую ролю ў вытворстве ільну, У РАДЗЕ РАЁНАЎ ПРАЯЎЛЯЕЦЦА АПАРТУНІСТЫЧНАЯ НЕДААЦЭНКА ВЫТВОРЧАЙ РОЛІ АДНААСОБНІКА. Іменна гэтым тлумачацца вельмі спаблыя тэмпы ільнаўборкі ў аднаасобных гаспадарках, асабліва паўночнай зоны (выканалі толькі 16,5 проц. пляну). З АПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДААЦЭНКАЙ АДНААСОБНІКА ТРЭБА РАШУЧА ПАКОНЧЫЦЬ. Трэба нападзіць штодзённую праверку выкананьня аднаасобнікамі кантрактацыйных дагавораў па ільне.

Разгортваючы масавую работу, змагаючыся з кулаком, арганізуючы калектыўнае цераблеьне ільну і вытворчую дапамогу аднаасобніку, мясцовыя партыйныя арганізацыі павінны дабіцца поспамогі і на гэтым адказным участку.

ВЫКЛЮЧНАЯ ЎВАГІ ЗАСЛУГОЎВАЕ ПРАКТЫКА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ, арганізаваная рабочымі Віцебскай ільнапрадзільнай фабрыкі «ДЗЬВІНА» калгасам Лёзьнянскага раёну. Рабочыя «Дзьвіны» паказалі ЎЗОР ПРАЛЕТАРСКАЙ ДАПАМОГІ калгасам. Яны пасталі людзей для арганізацыі зьдзельшчыны і ўліку ў калгасах, кваліфікаваных рабочых — для дапамогі ў будаўніцтве ільнапрацоўчых пунктаў, масавых работнікаў — для наладжваньня культурнай работы і г. д. Практычная дапамога віцебскіх рабочых ужо дала свае вынікі. Тое, што Лёзьнянышчына дабілася рашучага пералому на фронце ільнаўборкі, у значнай ступені зьяўляецца рэзультатам шэфскай арганізацыйна-вытворчай дапамогі рабочых «Дзьвіны». КАЛГАСЫ ЛЁЗЬНЯНШЧЫНЫ НЕ ЗАСТАЛІСЯ Ў ДАЎГУ. Яны на абавязацельствы віцебскіх рабочых адказалі ўзьняцьцем тэмпаў ільнаўборкі, разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ліквідацыяй прарываў на важнейшых участках арганізацыі працы, выпучэньнем адыходнікаў у тэкстыльную прамысловасьць.

ПРАКТЫКА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ВЫТВОРЧАЙ ДАПАМОГІ ВІЦЕБСКІХ РАБОЧЫХ КАЛГАСАМ ЛЁЗЬНЯНШЧЫНЫ ПАВІННА СТАЦЬ ЗДАБЫТКАМ УСЁЙ БССР, УСІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ. САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ЎЗАЕМАДАПАМОГА ПАВІННА СТАЦЬ АДНЫМ З АСНОЎНЫХ МЭТАДАЎ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ ЎБОРАЧНАЙ, АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ І ЗЯБЛІВА, ЗА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ ЗАМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ.

Палова ільнапасеваў выцераблена

ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ—НА ДАПАМОГУ АДСТАЮЧЫМ

УВАРАВІЧЫ. За апошнія 2 пяцідзённі жніўня з заселных 510 гэкт. ільну выцераблена 240 гэкт., што складае 47,5 проц. выканаўня пляну.

Першымі па ўборцы ільну ідуць калгасы імя Будзённага, Энгельса і Барашылава. Рад калгасаў прыступілі да абмалоту тэхнічных культур.

Аднаасобнікамі ўбрана ільну 468 гэкт. і канапель 3 гэкт.

Перадавыя калгасы Уваравіцкага раёну павінны неадкладна дапамагчы адстаючым калгасам, перанесьці ў іх свой вопыт, правільнай арганізацыі працы, гатым самым забясьпечыўшы своечасовую ўборку ільну ва ўсім раёне.

Казіміраў.

Безадказнасьць і самацёк

ДУБРОЎНА. Плошча, засеяная ільном і канаплямі па Дубровенскім раёне складае 7.428 гэкт. Здавалася-б, што дасягнутыя посьпехі ў часе веснавой сяўбы раённыя арганізацыі павінны былі замацаваць бальшавіцкімі тэмпамі ўборкі. Між тым, складзеныя пляны па ўборцы даведзены на 10 жніўня з 179 калгасаў толькі да 102; зьдзельшчына, уведзеная ў 102 калгасах, у большасьці сваёй фармальная. Паводле вестак раёна пераведзена на поўную зьдзельшчыну толькі 37 калгасаў.

Раён павінен атрымаць 17 малатарань «Эддзі», між тым да гэтага часу не атрымана ніводнай. На раёне выраб машын «Эддзі» вызначан у колькасьці 15 штук, а зроблена толькі 2. Машыны, якія ёсьць у раёне, знаходзяцца без нагляду, пад адкрытым небам. 20 дванаццаціраднага сявалак, атрыманых вясною, зараз не працуюць з-за адсутнасьці перадкоў.

Дзякуючы правапартуністычнаму кіраўніцтву, у МТС існуе паўнейшая абязьлічка і безадказнасьць. Штат трактарыстаў не ўкамплектаваны. Няўны штат, дзякуючы дрэннаму забесьпячэньню спажывецкімі таварамі і спецвопраткай, разьбягаецца. Улік працы і гаручага едсутнічае.

Задача раённых арганізацый Дубровеншчыны па-сапраўднаму перабудаваць сваю работу, ліквідаваць прарывы на фронце ўборачнай, дабіцца ліквідацыі абязьлічкі і самацёку. Прыняць усе меры па замацаваньні існуючых калгасаў і ачысьціць іх ад кулацкіх і варожых элементаў.

Упаўнаважаны ЦК КП(б)Б Кажэйнікаў.
Брыгадзір «Зьвязды» Куляшоў.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

аб ходзе ўборкі ільну па БССР на 15 жніўня

РАЁНЫ	Падлягае ўборцы ў гэкт.	Выцераблена ў гэкт.	Проц. выкан. пляну
Паўднёвая:			
Брагінскі	1783	1782	99,7
Б.-Капалеўскі	1624	1415	87,1
Бабруйскі	2642	1228	46,5
Веткаўскі	1988	700	35,2
Глускі	1755	189	10,8
Гомельскі	789	265	33,6
Жыткавіцкі	602	253	42,0
Жлобінскі	2109	1657	78,6
Кармянскі	3388	1594	47,0
Камарынскі	722	368	51,0
Каралінскі	816	467	57,2
Лоеўскі	1085	444	40,9
Любанскі	937	693	74,0
Лельчыцкі	621	565	91,0
Мазырскі	2196	1945	88,6
Нараўлянскі	1103	637	57,8
Парыцкі	1715	50	2,9
Пятрыкоўскі	1638		
Рагачоўскі	2467	1145	46,4
Рэчыцкі	3130	2958	94,5
Слуцкі	1897	939	49,5
Старобінскі	1054	582	55,2
Стара-Дароскі	1242	232	18,7
Тураўскі	616	133	21,6
Перахаўскі	2351	1940	82,5
Чачэрскі	1528	847	55,4
Чырв.-Польскі	4058	2225	54,8
Чырв.-Слабодзкі	875	106	12,1
Уваравіцкі	1754	709	40,4
Хойніцкі	1254	850	67,8
Усяго па Паўднёвай зоне	49739	26873	54,0
Цэнтральная:			
Асіпавіцкі	1521	236	15,5
Быхаўскі	1972		
Барысаўскі	1820	426	23,4
Вялынецкі	3179	965	30,4
Вялгомльскі	2810		
Бярозінскі	1408	932	66,2
Горацкі	7574	1393	18,4
Заслаўскі	969	23	2,4
Клімавіцкі	2966	620	20,9
Крупскі	5812	1216	21,7
Капыльскі	4343	155	3,6
Касьцюковіцкі	8575	885	10,3
Клічаўскі	2978	565	19,0
Койданаўскі	1219	35	2,9
Крычаўскі	2027	740	36,5
Лагойскі	996		
Магілеўскі	3152	1214	38,5
Мсьціслаўскі	5553	604	10,9
Менскі	520		
Прапойскі	1547	657	42,5
Пухавіцкі	2240	1176	52,5
Плешчаніцкі	1331		
Смалявіцкі	1480	674	45,5
Талачынскі	8105	1218	15,0
Чэрвеньскі	1071	513	47,8
Чавускі	4583	2330	50,8
Чэрыкаўскі	1668	521	31,2
Шклоўскі	7870	3600	45,7
Вузьдзенскі	896	302	33,7
Усяго па цэнтральнай зоне	90185	20105	22,3
Паўночная:			
Асьвейскі	2690		
Аршанскі	5606	729	13,0
Бешанковіцкі	4113	93	2,3
Віцебскі	1634	71	3,9
Вушацкі	4135	834	20,2
Гарадоцкі	13238	3379	25,5
Дубровенскі	7004	1855	26,5
Дрысенскі	7892	68	0,9
Лёзьнянскі	10302	4204	40,8
Лепельскі	6117	1547	25,3
Полацкі	5152	92	1,8
Расонскі	6006	800	13,3
Сураскі	7184	3112	43,3
Сенненскі	6373	1225	19,2
Сіроцінскі	7007	1115	15,9
Чашніцкі	4765	2284	47,9
Усяго па Паўночнай зоне	99451	18607	18,7
Разам па БССР:	239375	65585	27,4

ЛЕН ПЕРАСЬПЕЎ

У ДРЫСЕ ЗЛАЧЫННА БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЮЦЬ

ДРЫСА. Дрысенскі раён зьяўляецца адным з буйнейшых ільнаводчых раёнаў БССР. У ім ЗАСЕЯНА 9.500 ГЭКТ. ІЛЬНУ. Між тым, рад калгасаў Дрысенскага раёну яшчэ да гэтага часу не прыступілі да ўборкі ільну. У калгасе «ПРАГРЭС» ЛЁН УЖО ДАЎНО ПЕРАСЬПЕЎ, аднак, цераблеьне яго ўсё яшчэ не пачалося. Праўленьне калгасу лічыць, што «без машын распачынаць уборку ільну нямэтазгодна». Такое-ж становішча мае месца і ў калгасе «КАМІНТЭРН». У калгасах Каркалезіцкага сельсавету, ня гледзячы на тое, што ЛЁН ПОЎНАСЬЦЮ ПАСЬПЕЎ, УБОРКІ НЕ РАСПАЧЫНАЮЦЬ, АДКЛАДВАЮЧЫ ГЭТУ РАБОТУ ДА КАНЦА МАЛАЦЬБЫ.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі гэтых калгасаў апартуністычна недаацэньваюць палітычнага значэньня своечасовага сканчэньня ільнаўборкі. Райкалгас і райвазапсаюз не аддаюць належнай увагі ўборцы ільну. Яны нават ня ведаюць, як праходзіць уборка ў калгасах і ў аднаасобным сэктары. Ва многіх калгасах раёну няма плянаў. Больш 50 проц. калгасаў яшчэ не пераведзены на зьдзельшчыну.

Індывідуальным сэктарам заселна больш 4.000 гэкт. ільну. Між тым, ходам ільнаўборкі ў аднаасобным сэктары ніхто ня цікавіцца.

РК КП(б)Б і РВК павінны неадкладна павярнуцца тварам да ільну, прыняць рашучыя меры ў адносінах да апартуністаў з мясцовых зямельна-калгасных арганізацый і мабілізаваць масы на штурм ільну.

Убрана толькі 26 проц. збожжавых

Па ўдарнаму ліквідавацці прарыў на гэтым вучастку ўборачнай

На 15 жніўня па БССР УБРАНА 300.496 ГЭКТ. ЗБОЖЖАВЫХ ПРАВЫХ 26,1 ПРОЦ. (усяго засеяна 1.151... гэкт.).

МОЦНА АДСТАЮЦЬ УСЕ ЗОНЫ. ... сім недапушчальным зьяўляецца ... ставаньне раёнаў ПАЎДНЁВАЙ ЗОНЫ, дзе ўбрана ўсяго 38,5 ПРОЦ. ... НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА ідзе ўборка збожжавых І Ў ЦЭНТРАЛЬНАЙ зоне — ... проц. І ў РАЁНАХ ПАЎНОЧНАЙ ЗОНЫ —14 проц.

Толькі асобныя раёны выканалі больш паловы пляну. НА ПЕРШЫ МЕСЦЫ СТАЦЬ БУДА-КАШАЛЯСКІ РАЁН — 79,2 ПРОЦ., РЭЧЫЦКІ РАЁН УБРАЎ 60,4 ПРОЦ. ЗБОЖЖАВЫХ ЯРАВЫХ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ — 67,3 ПРОЦ., СУРАСКІ — 64,1 ПРОЦ.

Працягваньне такіх нікуды ніводнага тэмпаў уборкі збожжавых яравых ... граже вялікімі стратамі ўраджаю, асабліва з дажджамі, якія прайшлі ў апошнія дні.

У ІНТАРЭСАХ ЗАХАВАНЬНЯ ЎРАДЖАЮ, ТРЭБА ЗБОЖЖАВЫЯ ЯРАВЫЯ ЎБРАЦЬ У САМЫЯ ГЭТЫЯ ЖЭЙШЫЯ НЕКАЛІ ДЗЕН, МАБІЛІЗАВАЎШЫ НА ГЭТУ СПРАВУ ... ВОЛЬНУЮ РАБОЧУЮ СІЛУ І ЗРАЕШЫ АДПАВЕДНУЮ ПЕРАСТАНОЎКУ СІЛ НА ПАЛЯВЫХ РАБОТАХ. УЗМОЖНЯЮЧЫ ТЭМПЫ ІЛЬНАЎБОРКІ, І АБХОДНА АДНАЧАСОВА ПА-ЎДОБНАМУ ЗАВЯРШЫЦЬ УБОРКУ ЗБОЖЖАВЫХ. Гэта задача можа быць посьпехам выканана, калі раённыя і завыя арганізацыі ўсю сваю ўвагу ... сканцэнтруюць на пытаньнях ... неньня сапраўднай ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ, прыцягненьня да работы па ўборцы ПРАЦАЗДОЛЬНЫХ ЖАНЧЫН, ПРОСТКАЎ, наладзіўшы штодзённае АПЭРАЦЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА ... РАЧНАЙ.

ЗБОЖЖАВЫЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ УБРАНЫ, ЗЬВЕЗЕНЫ Ў ГУМНЫ І ЗАСЬЦІРТАВАНЫ НЕ ПАЗЬНЕЙ ЖНІЎНЯ. Такава катэгарычная дырэктыва ЦК КП(б)Б І СНК БССР. Невыкананьне гэтай дырэктывы пагражае ... лізарнымі стратамі ўраджаю. У ... гэтага самацёк і бязьдзейнасьць па ... цы збожжавых ня можа інакш расцэньвацца, як махровая правапартуністычная практыка, як простая дапамога ... паку.

РЭАЛІЗУЕМ АДОЗВУ ЦК І СНК АБ ЖЫВЁЛАГАДОЎ.

Перамога камсамольца ПУШКАНАВА САУГАС „ДРЫБІН“ ЗАХАВАЎ АПАРОС

САКРЭТ ПОСЬПЕХУ

ДРЫБІН, 15.

Сьвінасаўгас «ДРЫБІН» дабіўся значных посьпехаў у галіне захаваньня апаросу. З 1-га студзеня па 1-га жніўня 1931 г. у саўгасе нарадзілася 833 парасяты. За ўвесь час загінула ўсяго 58 парасят, што складае 7 проц. адыходу. Кожная матка ў гэтым саўгасе за адзін апарос дала 6 парасят або 12 таварных сьвіней у год.

Саўгас «Дрыбін» зьяўляецца першым у БССР па такім вялікім процанце адыходу парасят і па захаваньні апаросаў.

Якім чынам саўгас дабіўся такога посьпеху?

Усю зіму сьвінаматкі штодзённа выганяліся на прагулку на 2-4 гадзіны, з раньняй вясны яны знаходзяцца на пашы. Парасяты з 5-цідзённага ўзросту таксама трымаюцца на волі.

Кожны дзень увечары ўсё стада атрымлівае ў якасьці прымешкі да корму крэалін.

Такі мэтад догляду сьвіней загартоўвае іх, робіць больш устойлівымі і не дапускае пашырэньня ўсялякіх хвароб, асабліва чумы.

Работа сьвінароў пераведзена на зьдзельна-прэміяльную аплату. Сьвінары сапраўды зацікаўлены ў захаваньні апаросаў, бо ведаюць, што за кожнае захаванае звыш нормы парася яны атрымліваюць прэміі.

У значнай меры дасягнутых посьпехаў саўгас дабіўся пры дапамозе маладога, але вельмі адданага сваёй справе зоатэхніка-камсамольца Пушканава.

Б.

Калі дырэктар і старшыня рабачкому „на дачы“...

Усяго 12 вёрст аддзяляюць буйны жывёлагадоўчы саўгас «Прылукі» ад Менску. Але, жывучы ў «Прылуках», адасьцца, што знаходзішся вёрст за 300 ад чыгункі, у далёкай глушы.

Уся работа ў саўгасе вядзецца пастарому. Сацыялістычныя мэтады працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва — у саўгасе не ў пашане. 8 партыйцаў і кандыдатаў партыі, якія там працуюць, не зьяўляюцца ўдарнікамі.

Прамова тав. Сталіна па зьезьдзе гаспадарнікаў і адозва ЦК і СНК аб жывёлагадоўлі сярод рабочых не папулярызаваны. Гэтыя важнейшыя палітычныя дакументы невядомы рабочым саўгасу.

Такія факты сталі магчымы толькі з прычыны бязьдзейнасьці дырэктара саўгасу ЖЫВІЦКАГА і старшыні рабачкому ВАРАПАЕВА, якія фактычна нічога ня робяць і жывуць, як кажуць, «на дачы».

Таму зусім зразумела, чаму саўгас «Прылукі» пачаў уборку азімых і раньніх яравых пазьней, чым суседні саўгасы. Пляну ўборкі ў саўгасе няма. Вакол гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі не разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Нормы выпрацоўкі і расцэнкі рабочым невядомы. Улік праробленай працы не вядзецца. Машыны не прымацаваны да рабочых.

Горш за ўсё пастаўлена справа на скотным дворе. У чэрвені ўдой складаў 6,2 літра ад кожнай каровы ў дзень, а ў ліпені — да 3,5 літра. На скотным дворе таксама абязьлічка, каровы не замацаваны за даяркамі. Зьдзельшчына ўведзена толькі з 1-га жніўня і то фармальна. Улік выдаенага малака не наладжан.

Скотны двор дагэтуль даваў толькі страты, бо многія даяркі і на сённяшні дзень займаюцца забесьпячэньнем.

У пачатку вясны ў саўгасе прапала 20 калод пчол. Вылучаная для расьсьлеваньня гэтай справы камісія дагэтуль ніяк ня можа знайсьці вінаватых.

Саўгас «Прылукі» мае ўсе ўмовы для таго, каб быць паказальнай гаспадаркай. Усе вышэй адзначаныя агіднасьці зьяўляюцца вынікам апартуністычнай бязьдзейнасьці кіраўнікоў саўгасу, адсутнасьці масавай палітычна-выхаваўчай работы і падпасьці абязьлічкі, якая нанёс на ўсіх галінах гаспадаркі.

Мы патрабуем безадкладнага дэтальнага абсьледаваньня становішча ў саўгасе і аздараўленьня гэтай буйнейшай гаспадаркі.

Пагічанскі.

Пашырэньнем фэрм, фарсаваньнем будаўніцтва адказваюць калгасьнікі на адозву ЦК і СНК

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі знайшла жывы водгук сярод калгасных мас раёну.

Калгас ІМЯ СТАЛІНА, Запольскага сельсавету, на агульным сходзе абмеркаваўшы адозву партыі і ўраду, пастанавіў павялічыць стада малочнай фэрмы на 30 штук. Кожны калгасьнік абавязаўся прадаць калгасу для ўкамплектаваньня сьвінагадоўчай фэрмы па адным парасяці 6-цімесячнага ўзросту. Сход абавязаў праўленьне зараз-жа паставіць на адкорм сьвіней з тым, каб да першага студзеня даць дзяржаве ня менш 10 сьвіней.

Калгас «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», абгаварыўшы адозву, абавязаўся да 1-га верасьня скончыць будаўніцтва сьвінарніка і да 1-га студзеня ўкамплектаваць сьвінагадоўчую фэрму на 50 сьвінематак. Калгасьнікі пераплацілі таксама аграмадзіць усіх цялят.

Калгас імя «ПЕРШАГА МАЯ» абавязаўся арганізаваць трусагадоўчую гаспадарку з 300 матак, а калгасы «Друць» і імя Леніна абавязаліся арганізаваць птушніцкія гаспадаркі па 200 штук кожнай. Прычым калгасьнікі абавязаліся прадаць калгасу ад 1 да 5 птушак для ўкамплектаваньня птушніцкай фэрмы.

САЛАДУХІН.

Пра адозву ня ведаюць

РАСОНЫ. Вясной бягучага году Расонскім райвыканкомам былі атрыманы ад Наркамзему кантрольныя лічбы разьвіцьця жывёлагадоўлі ў Расонскім раёне.

Супрацоўнікі райвыканкому, атрымаўшы кантрольныя лічбы, запхнулі іх у шафу, дзе яны ляжаць і дагэтуль. Да калгасаў і сельсаветаў яны не даведзены. Адозва ЦК і СНК аб разьвіцьці жывёлагадоўлі не папулярызавана сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Сідаровіч.

Калгасьніца даглядае сьвінак.

Прадукцыйная жывёла не аграмаджана

МАЗЫР. (Наш кар.).

Ход укамплектаваньня калгасных жывёлагадоўчых фэрм у раёне нездавальняючы. 12 малочных фэрм павінны паставіць 1.650 кароў на сённяшні дзень ёсьць толькі 740 — 44,54 проц. пляну. Цялят на фэрмах замест 585 ёсьць 277—47 проц.

Сьвінагадоўчыя фэрмы таксама не ўкамплектаваны. Замест 2.720 сьвінематак на фэрмах ёсьць 581, што складае 21,39 проц. пляну. Падсьвінкаў замест 2.066 ёсьць 446.

Асноўнай прычынай слабога ходу комплектаваньня зьяўляецца тое, што ў радзе калгасаў раёну дагэтуль яшчэ не аграмаджана прадукцыйная жывёла і знаходзіцца ў індывідуальным карыстаньні калгасьнікаў. У калгасах імя Леніна, «Чырвоная ворка» і іншых гэтуль не праведзены ў жыцьцё пункты статуту с.-г. арцелі аб аграмаджаньні жывёлы.

Райкалгасаюз укамплектаваньня жывёлагадоўчых калгасных фэрм і ... даўніцтвам у іх зусім ня кіруе. Гэта справа прадастаўлена самацёку.

Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў Мазырскім жывёлагадоўчым раёне не папулярызавана сярод калгасных мас.

ЮШКЕВІЧ.

Ад рэзалюцыі—да канкрэтнай справы

Тав. Сталін у сваёй прамове на нарадзе гаспадарнікаў ва ўсю вышыню паставі

СВАЯЧАСОВА

АДРАМАНТАВАЦЬ І ПАБУДАВАЦЬ УСЕ ШКОЛЫ!



Будаўніцтва Менскага політэхнікуму

ШКОЛЫ НЯ МАЮЦЬ НАСТАЎНІКАЎ

На глядзячы на тое, што да пачатку навучальнага году засталіся лічаныя дні, Жлобінскія арганізацыі ў падрыхтоўцы бяздзейнічаюць.

Цалы рад школ кінуты на бяспрытульнасьць, між тым, як рамонт апошніх павінен быць даўно закончан. Гэта наглядаецца па Добраганчынскім і Праснурнянскім і іншых сельсаветах. У раёне распачата будаўніцтва 8 новых школ, а закончана ў тэрмін будуць толькі 2.

Навучальная сетка павінна павялічыцца на 42 камплекты, для чаго дадатковa патрэбны яшчэ 45 настаўн'каў. Раённая інспэктура палец аб палец ня ўдарыла ў матах укамплектаваньня школ настаўнікамі. Ужо наглядаюцца выпадкі плятунства і дэзэртырства з асьветніцкага фронту. Некаторыя настаўнікі яшчэ з мінулага году працуюць не па сваёй спэцыяльнасьці. Так, напрыклад, настаўнікі: Рудзь, Васілеўскі і інш.

Як ня дзіўна, але на сёнешні дзень сама інспэктура ня ведае, колькі ў раёне маецца напісьменных, ня кажучы ўжо аб іх узросьце і сацыяльным стане.

МАШНІЦКІ.

ПОЎНАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ

Падрыхтоўка да навучальнага году па Мазырскім раёне праходзіць слаба. Зусім адсутнічае ўлік няпісьменных і малапісьменных. Райком ЛКСМВ абавязаўся мабілізаваць 60 камсамольцаў па праверцы падрыхтоўкі да новага навучальнага году, але пастановы сваёй ня выканаў. Зусім слаба разгортваецца будаўніцтва школ. Як у горадзе, так і ў раёне нічога ня зроблена ў напрамку забесьпячэньня вучняў вопраткай і абуткам. Зусім ня створана грамадзкая думка сярод насельніцтва аб увядзеньні агульнага абавязковага навучаньня на базе сямігодкі. Намечанае будаўніцтва агульна-гарадзкой майстэрні для політэхнізацыі школ не праводзіцца.

Інспэктура нарасьветы нічога не зрабіла ў галіне забесьпячэньня школ праграмамі і падручнікамі.

Партыйныя і гаспадарчыя арганізацыі павінны з усёй рашучасьцю ўзяцца за падрыхтоўку да навучальнага году, каб распачаць заняткі своечасова.

Юшкевіч.

Партнарада па пытаньнях падрыхтоўкі да новага навучальнага году

Заўчора ў Менску скончыла сваю работу цуставая партыйная нарада па пытаньнях падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

На нарадзе прысутнічалі прадстаўнікі ад 24 раёнаў. Былі заслуханы справаздачныя даклады інспэктароў нарасьветы МЕНСКАГА, КОЙДАНАЎСКАГА, БАБРУЙСКАГА, СТАРОБІНСКАГА І ТАЛОЧЫНСКАГА раёнаў. Потым нарада заслухала даклад тав. ПЛАТУНА АБ ЗАДАЧАХ НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ. Дакладчык зьвярнуў асаблівую ўвагу нарады на ўмовы і характар праводзеньня ўсеагульнага і політэхнічнага навучаньня. Тав. ПЛАТУН адзначыў, што справа ўсеагульнага абавязковага навучаньня павінна быць пастаўлена на асаблівую вышыню Шпаркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва патрэбуюць карэннай зьмены асьветніцкай работы. Між тым частка раённых арганізацый: райвыканкомы, інспэктары народнай асьветы яшчэ добра гэтага не ўсьвядомілі. Адсюль марудныя тэмпы ў падрыхтоўцы да навучальнага году.

У гэтым годзе ўрадам БССР мяркуецца выдаткаваць на народную асьвету 268 млн. руб. Гэтыя вялікія ўкладаньні ў справу народнай асьветы трэба скарыстаць як мага з большай эфэктнасьцю.

Выступаючыя з раёнаў таварышы падавалі рад фактаў, якія сыгналізуюць, што справа з падрыхтоўкай да навучальнага году ў радзе месц знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

У БАБРУЙСКІМ РАЁНЕ 22 школы абсалютна ня маюць памяшканьняў. Няма ніводнага кіяцільніка ў той час, як іх патрэбна 60. Не хапае каля 80 настаўнікаў. Такое становішча інспэктар нарасьветы лічыць зусім нармальным. У КРУПСКІМ раёне больш 500 бярвеньняў, дастаўленых для будаўніцтва школ, ляжаць пад карою два гады. Некаторыя школы «будуюцца» па некалькі год (Руднянская і інш.). Ня лепш справа з будаўніцтвам школ і іх рамонтам і ў БАРЫСАЎСКІМ, ПЛЕШЧАНІЦКІМ, ЗАСЛАЎСКІМ і іншых раёнах.

Тыя раёны, якія ўлічылі важнасьць задач падрыхтоўкі да новага навучальнага году, далі сапраўды ўдарныя тэмпы работы. У ЧЭРВЕНЬСКІМ раёне падрыхтоўка да новага навучальнага году была пачата яшчэ ў красавіку. З 6-ці вызначаных для будаўніцтва школ зараз будуецца сем. Усе школы ўжо ўкамплектаваны вучнямі. БЕШАНКОВІЦКІ раён, у прыклад іншым, для будаўніцтва школ скарыстаў усе магчымасьці і рэсурсы, якія былі ў раёне. Ня дрэнна стаіць справа з будаўніцтвам школ у МЕНСКІМ І КОЙДАНАЎСКІМ раёнах.

Наглядаецца шмат выпадкаў няправільнага скарыстаньня школьных сродкаў. У ЗАСЛАЎСКІМ раёне сродкі, прызначаныя на народную асьвету скарыстаны на дарожнае будаўніцтва, што зьявілася асноўнай прычынай зрыву будаўніцтва раду школ. Інспэктар нарасьветы не прэчыў супроць гэтага недапушчальнага зьявішча, а палічыў поўным зьвярнуцца ў Народны Камісарыят Асьветы з просьбаю аб водпуску сродкаў на школьнае будаўніцтва.

На нарадзе выяўлена, што некаторыя работнікі цэнтральных установаў нядбайна адносяцца да будаўніцтва і забесьпячэньня школ патрэбнымі прыпадамі. Прадстаўнік Наркамснабу — тав. ШТЫХМАН — на пісьмовыя адносіны Наркамасьветы аб забесьпячэньні будаўніцтва школ агнятрывалым матар'ялам адказаў: «Шкада, што гэтыя паперы не папаліся ў мае рукі, я-б іх парваў». Праяўляюць недапушчальныя адносіны і пасобныя работнікі БДВ да забесьпячэньня раёнаў падручнікамі. Заяўкі некаторых раёнаў ляжаць у БДВ пад сукном.

Рад прафэсыянальных арганізацый праявіў недапушчальную бяздзейнасьць у галіне ліквідацыі няпісьменнасьці сярод рабочых. Гэта асабліва выразна наглядаецца па Менску і Віцебску, дзе справа ліквідацыі няпісьменнасьці была амаль сарвана.

Нарада вызначыла рад мерапрыемстваў у галіне забесьпячэньня асьветных установаў кадрамі работнікаў, асабліва па лініі дашкольнага выхаваньня. Наяўнасьць дашкольных работнікаў на сёнешні дзень забесьпечвае патрэбу ў іх толькі на 50 проц. Патрэбна 245 загадчыкаў хат-чытальнь і бібліятэкараў.

Нарада паказала на недапушчальнасьць скарачэньня плошчы дашкольных установаў. У некаторых мясцох гэта плошча замест пашырэньня зрузілася. Па гор. Менску яна зьменшылася больш, чым на палову. Паводле даных, зараз ахоплена 13 проц. дзетвары дашкольнымі ўстановамі і дзеці работніц на 50 проц. Нарада вызначыла рад мерапрыемстваў, накіраваных на пашырэньне дашкольных установаў. Вызначана прыступіць да пашырэньня дашкольнай кааперацыі і інш.

У галіне падрыхтоўкі культасьветных і навуковых кадраў нарада выказалася за больш сьмелае ВЫСОЎВАНЬНЕ на адказную навуковую работу перадавой, найбольш актыўнай і ідэйна-палітычна вытрыманай, часткі беспартыйнай інтэлігенцыі.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

аб ходзе друкаваньня падручнікаў і праграм для школ нацменшасьцяй

Назва	Яўрэйскія: усяго	Выйшла з друку	Друк УССР	Друк БССР	Цэнтрымасьцвяў	У друку	Матэрыял	Польскія: усяго	Выйшла з друку	Друк УССР	Друк БССР	Цэнтрымасьцвяў	Матэрыял	Літоўскія: усяго	Выйшла з друку	Друк УССР	Друк БССР	Цэнтрымасьцвяў	У друку	Матэрыял	Латыскі: усяго	Выйшла з друку	Друк УССР
Падручнікі																							
I канцэнтр.	16	2	6	5	2	—	1	13	4	5	3	1	—	9	—	1	1	2	—	1	3	2	—
II канцэнтр.	15	5	—	3	2	5	—	10	2	5	3	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Пункты і школы малапісьмен.	2	—	1	1	—	—	—	5	2	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Вечэрнія школы рабочых і калгасьнікаў	1	—	—	—	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Усяго	34	7	7	9	5	5	1	26	8	11	6	1	—	9	—	1	1	2	—	1	3	2	—
Праграмы:																							
I канцэнтр.	2	—	—	2	—	—	—	2	—	—	2	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
II канцэнтр.	3	1	—	2	—	—	—	2	—	—	2	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Усяго	5	1	—	4	—	—	—	4	—	—	4	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

Без гаспадара і сродкаў

ЛЯДЫ.

У мінулым годзе была адкрыта ў Лядзянскім раёне прафшкола культуры ільну і канапель, але гэта школа і па сёнешні дзень застаецца бяспритульнай. Памяшканьня сталага школа ня мае. Спачатку школа знаходзілася на бюджэце РВК, але праз некаторы час апошні паведаміў, што яна ў бюджэт ня ўключана і школа засталася без гаспадара і сродкаў.

Згодна пастановы СНК прафшкола павінна была быць рэарганізавана і саўгасвуч і перадана Ільнепікатросту. Аднак, гэтыя мерапрыемствы не праведзены, школа і зараз знаходзіцца ў катастрафічным стане.

Дудзько.

ЛІСТ З НЯМЕЧЧЫНЫ

БЭРЛІН У ЛІХАМАНЦЫ

Я заходжу ў так званы «залі Хаэрляндзі» каля Александэрпляцу. Там адбываецца арганізаваны рэвалюцыйнай прафапазыцыяй сход банкаўскіх служачых, якія пратэстуюць супроць доўгага затрыманьня зарплаты.

Даклад кампэнутата рэйхстагу тав. Нэйбаўэра выслухоўваецца з вялізарнай увагай. Чуецца, што кожнае слова выклікае ў слухачоў вельмі жывую зацікаўленасьць.

Па сканчэньні сходу я гутару з некаторымі з яго ўдзельнікаў. Адзін з іх, служачы «Камэрцыйнага вучотнага банку» расказвае: — Пэнсія ўжо даўно затрымліваецца. Усё вельмі дрэнна. Справа ідзе да канца. Нядаўна, што адзін з нашых вышэйшых чыноўнікаў мне заявіў: «Нашы дырэктары ўжо ўсе маюць у кішэні заграничныя паспарты». У гутарку ўмешваецца другі: «Што датычыць мяне, дык я лічу, што трэба з гэтым пэрадкам скончыць. Я гатоў на ўсё».

Трэці ўдзельнік нашай гутаркі скарджыцца, што яго пазбавілі пэнсіі, якая належыць яму, як удзельніку вайны. «Чаму-ж, — пытаецца ён, — не забралі пэнсіі ў нашых генэралаў, якія атрымліваюць шмат тысяч марак у месяц. Калі камуністы зьнішчаць гэту сыстэму, дык я буду разам з імі...»

Адзін з партыйных таварышоў, прысутных пры нашай гутарцы расказвае, што «фашысты, якія раней актыўна выступалі ў колах банкаўскіх служачых, цяпер адразу замаўчалі і ўхіляюцца ад усякіх палітычных дыскусій з камуністамі».

***

Звоначы і грукаючы на паваротах, трамвай хутка імчыцца па Мюлерштрасе, у напрамку да раёну «Борэізальдо-Тэгель». Гэты раён носіць імя Борэіга, уласьніка аднаго з буйнейшых бэрлінскіх прадпрыемстваў. На адлегласьці некалькіх кілёмэтраў раскінуліся фабрычныя корпусы і палац заводаўласьніка. «У добрыя часы» на заводзе працавала 11-12 тысяч рабочых, цяпер там засталося ледзь 3 тысячы.

У вагоне я наглядаю сустрэчу двух знаёмых, якія разам працавалі ў Борэіга. «Я ўжо без работы з зімы 1929 г.» гаворыць: «А ты?». «Я быў зволены ў маі 1930 г. і больш работы відзе не знаходзіў...» «Заедзем да мяне, калі ты часу маеш...»

Я [illegible] адзінае, што ёсьць у абытку ў беспрацоўнага. Зразумела, чаму гэта запрашэньне зараз-жа прымаецца.

Я таксама накіроўваюся туды, дзе жыве кой трамвайны спадарожнік, у калёніі беспрацоўных ля ракі Тэгель. Хвіліна праз 20 я далучаюся да маіх выпадковых знаёмых.

У гэтай калёніі жывуць 200-300 чал. Гэта бэрлінскія беспрацоўныя, якія [illegible] на кварталцы за [illegible] месяцы, ці наогул, якія не маюць магчымасьці аплаціць яе, выехалі ва горад, дзе набудавалі сабе «дом». Дом жыва напамінае сабачую кануру.

Звычайна ў сялянскіх дварох у такіх буды́ках, але больш моцных, жывуць ланцуговыя сабакі. Тут-жа — беспрацоўныя. У адной палове «дому» салема — тэта спальня, у другой палове — мізэрны сварб. Два разы ў тыдзень жыхары канур едуць у горад каб зарэгістраваць на біржы. У горадзе-ж яны купляюць харчы — хлеб і крыху расьлінных тлушчаў.

Так жыве «штэмпельная братва» ва ўсіх гэтых канурах. Першым, хто ўгадаўся вынайсьці «гэту дачу», прышло ся весьці ўпартую барацьбу з вартаўнікамі ляснічства, якія разбурвалі гэтыя цацачныя домікі і выганялі жыхароў. Але в часам, калі да больш ціхіх беспрацоўных дазучыліся «бяспрытульныя», г. зн. беспрацоўныя, якія больш году ня мелі жыльля, атакі ляснічтва былі адбіты.

Калі гэтых «бяспрытульных дачнікаў» запытаеш, што яны думаюць рабіць узімку, яны адказваюць: «Пакуль лета, а ўзімку будзе рэвалюцыя».

Калі мы пройдзем ад усходняга боку возера Тэгель хвілін 30, дык хутка нам пераградзіць дарогу вялізарная сьцяна, вышынёю ў два мэтры. Шырокавяшчальныя абвесткі пазгаджваюць: «Сьцеражэцеся самастрэлаў і злых сабак». Гэта палац п. Борэіга, палац з 50 вокнамі, выходзячымі на возера. Ён акружаны прыгожым паркам, 60 пансіяў у палацы п. Борэіга і «дачы» беспрацоўных.

З вакон свайго палацу яго ўласьнік можа любавацца сваімі заводамі, якія відаць далёка. На заводах Борэіга будуюцца паравозы, электравозы і прадметы хатняга абіходу.

Рабочыя яго аплачваюцца горш, чым дзе-небудзь на ўсім Бэрліне. Ячэйка кампартыі налічвае каля 50 таварышоў-казалёў, дапаможных рабочых, інструментальшчыкаў, транспартных рабочых, служачых і інш. У ёй прадстаўлены ўсе адцазы і цэхі. У фабзаўкоме камуністы маюць абсалютную большасьць. Частыя сходы, шматлікія лістоўкі і лятучкі, баявы настрой рабочых — усё гэта сьведчыць аб насыпаховай рбоце кам'ячэйкі.

Мне на днях прышлося прысутнічаць на сходзе 300 рабочых гэтага заводу. Усе 300 былі аднадушны. Яны заявілі: «далейшае зьніжэньне зарплаты немагчыма. Мы адкажам на яго ня толькі пасыўнымі, але і актыўным супраціўленьнем». Такі настрой характэрны ня толькі для заводу Борэіга, але і для ўсёй металяпрамысловасьці Бэрліну.

***

Еду назад з Борэігоўскіх уладаньняў. У трамвай уваходзіць пажылы трамвайны служачы, кантралюючы білеты. У руках у яго кавалак хлеба. Стары бурчыць: «Нават зьесьці не дасьпееш. Сьпяшыш. Рабочы дзень падоўжылі, а ці будуць плаціць — невядома».

«Вы працавалі 25 год — пытаюся я, бачучы ў яго на шапцы адзнаведны значок». «Так, адказвае ён, але так парпыва, як цяпер, ніколі ня было. Я заробляю цяпер менш, чым калі-б то ні было за ўсе 25 год маёй работы»...

І ў дадатак, калі я еду па горадзе і бачу гэтыя чаргі ўкладчыкаў за банкаў, дык нявольна ўспамінаю аб тых апошніх маіх зьбіраньнях, якія забраў у мяне банкаўскі крах».

Гэта рэпліка трамвайнага кантралёра выклікае ў вагоне новыя ажыўленыя дыскусіі аб крызісе і аб шляхах вызваленьня ад яго.

Выходзячы з вагону, трамвайны кантралёр заўважае: «Прыдзецца нам, відавочна завозьці вагоны ў дэпо і зачыніць гэту крамку. Нехай водзіць вагоны хто хоча, але толькі ня мы».

Г. Андрыс.

ПА ШПАЛЬТАХ ІНДЫЙСКІХ ГАЗЭТ

НОВАЯ ПАЛАСА РЭПРЭСІЙ

Урад Індыі адкрыў новы разьдзел гісторыі прасьледаньня рэвалюцыйнага руху ў гэтай калёніі англійскага імпэрыялізму. Урад пускае ў ход новыя рэпрэсіі, стараючыся задушыць у першую чаргу ўзрастаючы сялянскі рух, які ўсё больш набывае рэвалюцыйную афарбоўку і характар.

Прычын якія выклікаюць рэзкі рост рэвалюцыйных настрояў сярод сялянства, больш чым вытарчальна. Галеча і голад ахапляе ўсё больш шырокія пласты сялянства. У результаце амаль штодзённа з розных мясцовасьцяй Індыі паступаюць весткі ня толькі аб пагоршаньні матар'яльнага становішча сялянства, але і аб росьце яго палажэньня і гатоўнасьці змагацца рэвалюцыйным шляхам супроць існуючага ладу.

Вялікага размаху дасягае рух супроць уплаты падаткаў, які асабліва шырока разьвіт у аб'яднаных правінцыях. У іх усё больш выразна пачынаюць праяўляцца характэрныя адзнакі, якія сьведчаць, што гэта нішто іншае, як самая сапраўдная клясавая барацьба.

Сялянскі рух пачынае вылівацца нават у форму адкрытых «бунтаў» супроць упады і выклікае энергічную трывогу ўраду, у якога, як адзначаюць некаторыя газэты, «адкрылися вочы». Не малую ролю ў гэтых адносінах адыграў, відома, і той факт, што сялянства пад уплывам рэвалюцыйнай прапаганды ўсё больш вызначэнна з сетак, расстаўленых лідэрамі кангрэсу.

Імкнна таму рэпрэсіі ўраду накіраваны з асаблівай сілай ня толькі супроць сялян — непасрэдных удзельнікаў рэвалюцыйных выступленьняў, але і супроць тых, хто па думцы ўраду, зьяўляюцца застрэльшчыкамі «сялянскіх мецяжоў».

У аб'яднаных правінцыях махровым цьветам расквітнеў тэрор супроць рэвалюцыйнага сялянства. Сотні сялян амаль штодзённа арыштоўваюцца і зьбіваюцца.

Урад матывуе свае рэпрэсіі жаданьнем «з коранем вырваць рэвалюцыйную заразу, якая прыводзіць да адмаўленьня ад уплаты падаткаў». Больш таго, арыштоўваецца нават тып, хто, ня прымаючы актыўнага ўдзелу ў барацьбе рэвалюцыйнага сялянства, выказвае тым ці іншым чынам свае спачуваньне яму.

Англа-індыйская газэта «Пэйпэр» заўважае, што ў аб'яднаных правінцыях «палітэцыя ня менш 10 тыс. чалавек, якія хоць фармальна ня зьвязаны ні з якімі арганізацыямі, але фактычна імкнуцца аказаць падтрымьцьне руху супроць падаткаў».

Штодзённая газэта «Індустан Таймс» у нумары ад 5 лістапада указвае, што вялікая колькасьць як фармальна беспартыйных, так і радавых членаў кангрэсу у аб'яднаных правінцыях арыштоўваецца і прадпушчаецца ўладаю даць падпіску ў адмаўленьні ад антыўрадавай дзейнасьці. Асобы, якія не жадаюць даць падобную падпіску, падлягаюць суровому судовому спагнаньню.

Памешчыкам даны спэцыяльныя інструкцыі, якія прадпісваюць «самым энергічным чынам» спагнаць у сялянаў падаткі, зварочваючыся ў выпадку патрэбы да ўслуг паліцыі, якая цяпер прадастаўлена ў іх распараджэньне.

Памешчыкі, вядома, цалкам выкарыстоўваюць прадастаўленыя ім правы, а ўрад, са свайго боку, таксама праводзе не малую «актыўнасьць». На дзень таму, што тая-ж газэта «Індустан Таймс» часта паведамляе аб шматлікіх арыштах членаў «Наўджаван Бхарат Себха» (Союз новай молодзі) і іншых рэвалюцыйных арганізацый. Тыя арганы друку, якія якім-небудзь чынам зьвязаны з гэтымі арганізацыямі, падпадаюць пад мацнейшыя рэпрэсіі, шматлікія вобыскі і канфіскаты.

У Бэнарэсе было забаронена і канфіскавана 400 экз. брашуры, якая паведамляе аб матах і задачах гэтага саюзу.

Гандзі ў сваім штодзённіку «Малада Індыя» у нумары ад 9 лістапада прыводзіць цэлы сьпіс «вопытных» нарушэньняў яго «дагавору з лёрдам Ірвінам», прычым, гэтыя нарушэньні месцца на віне ўраду. Перылічаным Гандзі нарушэньні мелі месца ў аб'яднаных правінцыях Бенгазі, Бэнарэсе і іншых мясцовасьцях Індыі. Лідэры кангрэсу на чале з Гандзі, яўна слушна бачылі, што гэтыя нарушэньні прыводуць да новага росту рэвалюцыйнага руху, шукаюць новых шляхоў і метадаў для задушэньня гэтага руху. Вельмі характэрна таму навыцця, якую займае Гандзі. У адным з апошніх сваіх артыкулаў, Гандзі, прасьвядчыўшы некалькі разоў сваргам а прымусіў гаалу а боку ўраду, піша: «Мне[illegible]рыя непрыхілныя чэны кангрэсу, прачытаўшы гэты каталог скарг, могуць сьпытаць: як доўга будзем мы чакаць і чуць гэта? Мой адказ усё той-жа. Пакінем чакаць да тэй пары, пакуль рабочы камітэт палічыць гэта неабходным. Мы згадзілі прапанаваць выканаць нашу частку згоды. Чым больш нашы страданьні, тым больш будзе нашае сілы.

Але гэта пропаведь пакорлівасьці і цярпілівасьці выклікае незадавальненьне, не толькі ў аб «Наўджаван Бхарат Себха» і ўраде тых самых мясцовасьцяй, якія весна галасавалі за кангрэсу. Бамбейская «Ліга молодзі» выдала ўхвалу рэзалюцыю, у якой патрабуе, каб кангрэс пакінуўшы пачаў рух грамадзянага непадпраздкаваньня і сапраўдзілаўскай кампаніі.

Хоць кіраўніцтва «Ліг молодзі» пасьлядоўе ўстаноўці лідэраў кангрэсу (старшыня Бамбейскай «Ліг молодзі» Нарымэн заўважыў таксама старшыня бамбейскага правінцыяльнага кангрэсу і членам рабочага камітэту кангрэсу), аднак тым ня менш пасьмелыя факты, што сярод радавых членаў гэтых ліг пасьлядоўнае сурэвае незадавальненьне. Тыя ж сьвядомыя трывогі выказвае пашыраная вялікідзкай штодзённая газэта «Лідэр», што выходзіць у Аллахабадзе, якая заяўляе, што Гандзі ступіў бы добра, калі-б запрасіў ўсе «Ліг молодзі».

Вялікі ўплыў сялянства на палітычнае выступленьне бамбейскай лібэральнай штодзённай газэты — кіраўніка органу індыйскага тэкстыльнага капіталу — «Індыан-Дэйлі Мэйль». Выказваючы ўпэўненасьць, што пры цяперашніх умовах кангрэсная палітыка [illegible] ліма 1, будучы цьвёрда ўсталёўвае у [illegible] пярэвалюцыйнасьці Гандзі, гэта газэта піша у рэдакцыйным артыкуле аб [illegible] ізмене, што «Гандзі пачынае больш [illegible] чыца скарэйшаць свае стаўленьні, як дыктатар».

Сакрэтарыя становішча ў Індыі, [illegible] гэта палкрэсьлівае: «Ідэя Гандзі [illegible] адлівіся, дык, сапраўдна, што стварэньне [illegible] нацыянальная партыя, якая адыграе [illegible] бую ролю і распадзе [illegible] Індыі».

Гэта спроба прадпісываецца ў [illegible] будзе праведена пры дапамозе таму і «Бэранскія Індыі будуць адкінуты [illegible] як гэта зробіцца і адарвацца з Кораннымі навогуа».

Ня спыняцца на поўдарозе

Г. Хаськін

Пытаньню перабудовы спажывецкай кааперацыі партыя аддае вялікую ўвагу. Апрача раду спэцыяльных пастаноў, заслухоўваньня дакладаў аб ходзе перабудовы — пры ЦК КП(б)В былі скліканы дзве спэцыяльныя нарады па пытаньні аб ходзе перабудовы спажывецкай кааперацыі. Гэта яшчэ раз пацьвярджае, якое значэньне надае партыя рабоце спажывецкай кааперацыі на даным этапе нашага сацыялістычнага будаўніцтва і тэй перабудове, якая карэнным чынам зьмяніце ўсю сыстэму яе работы.

Было-б шчэрна адмаўляць, што перабудова не прасоўваецца наперад, хоць тэмпы, прайшоўшы з моманту пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)В—яўсім дастатковы, каб гаварыць ужо не аб прасоўваньні ўперад справы перабудовы, а аб яе завяршэньні.

На сёнешні дзень па Беларусі працуюць каля 110 спэцыялізаваных магазынаў галіновых аб'яднаньняў. Вызначана да прыняцьця яшчэ каля 100 спэцыялізаваных магазынаў.

Асноўным рэшаючым недахопам ва ўсім ходзе перабудовы зьяўляецца тое, што няма прыкметных зрухаў у самым зьмесьце работы.

Становішча работы, якасьць абслугоўваньня засталіся ранейшымі і па сутнасьці рад пытаньняў перабудовы спэцыялізаванага гандлю, дзякуючы гэтым прычынам — не дае яшчэ належнага эфэкту ў справе палепшэньня абслугоўваньня спажыўца, спрацьцьвіньня самога кіраўніцтва гандлю і г. д. Многія работнікі сыстэмы яшчэ не зразумелі, што адным з важнейшых пытаньняў пры праведзеньні спэцыялізаванага гандлю зьяўляецца пераход ад разьмеркаваньня прадуктаў і тавараў—да гандлю іх.

Зусім нездавальняюча праходзіць работа па пашырэньні гандлёвай сеці, ня гледзячы на тое, што гэта зьяўляецца важнейшай задачай перабудовы спажкааперацыі.

Чаму неабходна паставіць у цэнтры ўвагі ўсіх кааперацыйных, савецкіх, прафэсыянальных і партыйных арганізацый пытаньне аб пашырэньні гандлёвай сеткі, у адпаведнасьці з пастановай Бюро ЦК КП(б)В?

Па-першае таму, што ў нас узрасьлі і пачынаюць узрастаць вялікія магчымасьці пашырэньня харчовай базы для забесьпячэньня рабочай клясы. Мы маем у гэтым годзе ў параўнаньні з мінулым вялізарнейшы рост гароднінай прадукцыі, як на прыгарадных гаспадарках, так і на абагуленым сэктары сельскай гаспадаркі. У гэтым годзе пастаўлена па-новаму пытаньне аб праве загатоўкі кааперацыйнымі арганізацыямі плодагароднінай прадукцыі. Зараз даны шырокія правы і магчымасьці рабочаму кааператыву шырока разгортваць ініцыятыву па загатоўцы народнінай прадукцыі.

Таксама ўзрасьлі і ўзрастаюць магчымасьці па дадатковым выпусканьні іншых таварных рэсурсаў. Добрая пастаноўка работы ў выпусканьні дадатковых крэдыт і рэсурсаў дасьць рад зусім рэальных вынікаў. Тут вялікае значэньне мае самакамплектаваньне, дзе рад вырабаў можна ня толькі пашырыць, але і выпрацоўваць новыя віды іх і г. д. Гэта бязумоўна патрабуе пашырэньня гандлёвай сеткі.

Па-другое: — сыстэма разьмеркаваньня, якая існуе ў сучасны момант не падыходзіць. Практыка вылучы мясцічага пайка рабочым па ўсіх прадуктах у адзін раз—прыводзіць да таго, што работы спажывец вымушан пераставацца ў паўгутаніка. Гэтая практыка забесьпячэньня рабочых прадуктамі і таварамі ў далейшым павінна быць зьменена.

Тое, што мы будуем спэцыялізаваны гандаль ужо адпачае пераход ад разьмеркаваньня да гандлю, вразумела, ня гандлю, у якім узьвялася стаўня мэтады камэрцыі. Мы перакладзім да такога гандлю, які павінен зацікавіць спажыўца і абслугоўваць яго значна лепш, чым да гэтага часу.

Далейшая практыка павінна базавацца на продажу спажыўцу неабходных тавараў і прадуктаў, прычым сыстэма продажу нарэзаных прадуктаў асобным катэгорыям пакупнікоў, павінна поўнасьцю забесьпечваць і гарантаваць магчымасьць куплі ў любых разьмерах на працягу [illegible] колькасьці нарэзаных прадуктаў, якая [illegible] даная група насельніцтва. Гэта патрабуе пашырэньня сеткі, а тым каб поўнасьцю былі зьвяшчаны чаргі ў магазынах і пяроўнамернае разьмеркаваньне прадуктаў і тавараў на гандлёвай сетцы.

Многа кааперацыйных арганізацый і іх кіраўнікі яшчэ і па сёнешні дзень не разумеюць, што пытаньні пашырэньня сеткі, спэцыялізацыі гандлю, перабудовы сыстэмы разьмеркаваньня на сыстэму гандлю — зьяўляюцца рашаючымі пытаньнямі работы па перабудове—і адгэтуль замест рашучых дзеянняў, як у галіне далейшага разгортваньня спэцыялізаванага гандлю, так і адкрыцьця новых магазынаў і крам, маюць месца сутаркі права - анархістычнага парадку, аб тым, што пашырэць сетку асабліва няма патрэбы, тавараў мала, існуючыя магазыны не запоўнены і г. д. і г. д.

Няма зніжэк прыкметных зрухаў у барацьбе за чысьціту магазына і дадзіканьня адносіны да пакупнікоў. Антысанітарнае становішча і грубасьць застаюцца ганебным зьявішчам у рабоце гандлёвай сеткі. На будзе вінай перабудовы, калі мы ня зьвішчым за ўсёй рабоце спажкааперацыі такіх фактаў, як антысанітарыі і грубых адносін да спажыўца.

Не дасягнута яких - небудзь значных вынікаў і ў справе ўкараненьня гаспадарчага разрахунку ва ўсёй рабоце спажкааперацыі.

Праверка паказала, што пераход на гаспадарчы разрахунак магазынаў, сталовак і інш. прадпрыемстваў вроблен фармальна. Мала ў нас магазынаў, сталовак і інш. прадпрыемстваў кааперацыі, якія працавалі-б на гаспадарчым разрахунку. Трэба такому становішчу палажыць канец. Далейшых гутарак аб пераводзе на гаспадарчы разрахунак, аб рэнтабельнасьці работы і прыбытках—быць ня можа. Неабходна ажэм рэальнай кампэнсацыя дабіцца ў кожнай арганізацыі, у кожным прадпрыемстве, магазыне і сталоўцы—поўнага гаспадарчага разрахунку. Мы прапануем неадкладна перанесьці на гаспадарчы разрахунак магазыны з зваротам у 100 тыс. руб. у месяц, а таксама больш-менш буйныя сталоўкі з вылучэньнем самастойнага [illegible] з выдачэньнем [illegible] і загатоўкі неабходных прадуктаў і тавараў.

Адначасова неабходна дабіцца такога ўдзеяньня магазынаў і сталоўкамі, якая існуе ў любым прадпрыемстве, у любой галіне прамысловасьці. Трэба кардынальным чынам зьмяніць існуючую дробную апеку з боку ЦРК, ЗРК і інш. арганізацый над гэтымі прадпрыемствамі. Трэба прадастаўіць усе неабходныя гаспадарчы - арганізацыйныя правы кіраўнікам гэтых прадпрыемстваў.

Неабходна таксама разгарнуць барацьбу за эканомію, зьніжэньне гандлёва-арганізацыйных выдаткаў і выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў.

Арганізацыі, што ёнаке знаходзяцца ў ніжкім фінансавым становішчы, не разумеюць што ўсе сілы і ўся ўвага павінны быць накіраваны ў бок ажыцьцяўленьня на гаспадарчага разрахунку, эканоміі ў рабоце, зьніжэньня гандлёва - арганізацыйных выдаткаў і выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў, а не ў бок патрабаваньня пераліченьня лімітаў, трабаваньні Дзяржбанку, замест вырашэньня асноўных задач — вызваленьня дзяржгаўных сродкаў са зваротаў кааперацыі на справу індустрыялізацыі.

Важнейшай задачай вызваленьня ўмаганізацыі ім ўсёй справы забесьпячэньня і на гэтай падставе палепшэньня забесьпячэньня рабочых важнейшых галін прамысловасьці.

Для гэтай мэты мы павінны зараз правесьці рад мерапрыемстваў—пашырэньне сеткі ЗРК, ажыцьцяўленьне значна большую колькасьць прадпрыемстваў іх сеткай, павяр тых прадпрыемстваў, дзе колькасьць рабочых будзе значна менш двух тысяч; стварыць спэцыяльную групу пры ВКС на непасрэдным кіраўніцтве і дапамозе рабочым кааператыванам ва ўсёй іх гаспадарчай і арганізацыйнай дзейнасьці.

Вялікім экзаменам на ўсёй рабоце спажыўкааперацыі на падставе не перавыбраны ня ўключана і школа засталася без гаспадара і сродкаў.

Згодна пастановы СНК прафшкола павінна была быць рэарганізавана і саўгасвуч і перадана Ільнепікатросту. Аднак, гэтыя мерапрыемствы не праведзены, школа і зараз знаходзіцца ў катастрафічным стане.

Дудзько.

ЗА ЗДАРОВУЮ ПРАЦУ І БЫТ

ЗА ЧЫСТЫ ЦЭХ, ІНТЭРНАТ І СТАЛОУКУ!

РЭАЛІЗАВАЦЬ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ І ЎРАДУ АБ ПАЛЯПШЭНЬНІ БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАНЬНЯ РАБОЧЫХ

Раённы друк, рабселькоры, у паход супроць антысанітарыі

Неадкладна ўключыцца ў паход за санмінімум

Менскі Гарадзкі Камітэт КП(б)Б прызнаў работу па ажыццяўленьні санітарнага мінімуму ў Менску нездавальняючай.

Прапанавана ўсім партыйным, прафсаюзным і гаспадарчым арганізацыям неадкладна ўключыцца ў гэту работу, дабіцца ў дзкадны тэрмін карэннага паляпшэньня санітарнага становішча пэхаў, сталовак, інтэрнатаў і інш., мабілізаваўшы вакол гэтай справы ўсіх рабочых.

Прапанавана Камгасу ў дзкадны тэрмін забясьпечыць бесьперабойную працу лазень і пралень. Межрыдсаюз павінен прыцягнуць да паходу за санмінімум усіх членаў ЖАКТ'аў, жонак рабочых і хатніх гаспадынь.

Праз дзьве дзкады бюро Гаркому КП(б)Б заслухае даклады гарпрафсавету, Менкамгасу, партыялектыкаў заводаў «Бальшавік», «Камунар» і «Кастрычнік» аб іх удзеле у паходзе за санмінімум.

Жакты ігнаруюць санмінімум

Санітарнае становішча дамоў жактаў г. Менску ўсім нездавальняючае. Дзкаднік «за чыстату», што праводзіўся ў ліпені, прапаў міма ўвагі работнікаў жактаў, якія не накладаюцца аб ажыццяўленьні санітарна-гігіенічнага мінімуму.

Шмат дамоў, у тым ліку і ў цэнтры гораду, вылучаюцца сапраўднымі вачагамі заразы. Возьмем, напрыклад, дом № 73 па Савецкай вуліцы. Усюды—сьмяцьцё, прыбіральні запушчаны, ніякіх прайсьці праз двор. Між тым, на двары жывуць шмат сямей і працуе фатаграфія.

Ня лепшае становішча і ў домах па Рэвалюцыйнай, Ленінскай і інш. цэнтральных вуліцах.

На агідное становішча дамоў жактаў гаршчаюць і праўленьні жактаў зусім не рэагуючы, спасылаючыся на тое, што «засанітарнае працае дрэнна, ад яго і патрабуйце, а мы тут ні ў чым ня вінаваты».

Чаму—пытаемся мы—, жакты заварушыліся толькі ў самыя апошнія дні і зусім нядаўна прыступілі да фармавань ня свайго абозу. Абоз пачне працаваць толькі 1-га верасьня, да і то ў ліку 13 хурманак. Дзе былі жакты раней? У многіх домах няма скрынь для сьмецьця. Нядаўно-ж было так цяжка абсталяваць у кожным двары сьмяцьцёвыя скрыні?

У горадзе абсталявана каналізацыйная сетка. Жакты не падумалі аб уключэньні ў яе сваіх домоў. Яны лічаць, што могуць абыйсьціся і без каналізацыі.

Гаржыльсаюз і жакты ня цікавяцца забясьпячэньнем насельніцтва дабраякаснай піцьцёвай вадой. Гарсанінспэкцыя ўстанавіла, што ў радзе артэзыянскіх студняў вада надзвычайна забруджана і не польга раіць піць. Жакты нічога не зрабілі, каб палепшыць вадазабесьпячэньне. Ніхто не даглядае за артэзіянскімі студнямі, якога іх вялікуна кучы сьмецьця і гною, які прасочваецца ў глебу і забруджвае ваду.

Усё гэта сведчыць аб злачынна-пядбайных адносінах да выкананьня элементарных санітарна-гігіенічных запатрабаваньняў, аб тым, што жакты мала цікавяцца справай паляпшэньня бытавых умоў працоўнага насельніцтва.

Калі-ж узьнікае пытаньне аб прыцягненьні да адказнасьці тых, хто ігнаруе элементарныя правілы санітарыі і гігіены, дык аказваецца, што фактычна ніхто не адказвае за агідасьць; ні ў жактах, ні ў гаржыльсаюзе няма людзей, якія-б занялісь справай ажыццяўленьня санмінімуму і непасрэдна за яго адказвалі.

Трэба прымусіць жыльлёвую каапэрацыю на справе заняцца правядзеньнем санітарнага мінімуму.

Мясцовы.

„Санмінімум“ Полацкага ЦРК

ПОЛАЦАК. Горад вельмі дрэнна забясьпечан вадою. Колькасьць артэзіянскіх студняў дзёбка не адзавальне ўзрастаючых патрэб насельніцтва і будаўніцтва.

Мала таго, вада, якая ідзе са студняў надзвычай забруджана і ня можа ўжывацца для піцьця. Студні разбураны, акружаны нечыстотамі, ніхто за імі ня сочыць. Горад увесь час знаходзіцца пад пагрозай эпідэмічных захворваньняў.

Гаспадарчыя органы (ЦРК, нараб., рабфуд і інш.) ніколі ня лічацца з пастановамі гарсавету аб падтрыманьні чысгаты і санмінімуму, ігнаруюць іх. Ні адна з гэтых арганізацый ня прыцягнута да адказнасьці.

Для характарыстыкі безадказнасьці Полацкага ЦРК досыць прывесьці наступны прыклад. У часе дзкадніка чысгаты, ЦРК, як-бы ў зьдзек над ім..., пачаў будаваць авалачны пункт каля ракі Палаты, на тым месцы дзе знаходзіцца адна з буйнейшых у горадзе артэзіянскіх студняў, без належнага дазволу на гэта гарсавету.

Гарсавет катэгарычна забараніў ЦРК будаваць авалачны пункт каля студні. Але кіраўнікі ЦРК як ні ў чым ня бывала праводзяць далей будаўніцтва.

Такіх адносін да санмінімуму пярпець далей нельга. Праўленьне ЦРК і ўсе іншыя ўстановы і асобы, якія арыгаваць барацьбу за аздаравленьне быту павінны быць неадкладна прыцягнуты да судовай адказнасьці.

С-н.

Палепшым бытавыя ўмовы калгасьніц

Для таго, каб правільна арганізаваць жаночую рабочую сілу ў калгасах і саўгасах, каб уцягнуць усіх працаздольных жанчын у работу па ўборцы ўраджаю, трэба аддаць максымум увагі справе арганізацыі ясьляй і пляцовак. Такую дырэктыву даў ліпеньскі пленум ЦК КП(б)Б. Як выконваецца дырэктыва пленуму панымі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі?

Сетка дзіцячых ясьляй, у параўнаньні з мінулым годам, вырасла ў два разы — замест тысячы ясьляй, ёсьць каля 2-х тысяч. Разгарнуць такую сетку ўдалося дзякуючы ініцыятыве самога насельніцтва, ініцыятыве шырокіх калгасных мас. Аднак, у радзе месц наглядаюцца зусім няўважлівыя адносіны раённых арганізацый да стварэньня ясьляй і пляцовак. Ёсьць выпадкі, калі закрываюцца ўжо арганізаваныя ясьлі.

У Чэрвеньскім раёне, у часе ўборкі ўраджаю, работніцы ясьляй, якія скончылі спэцыяльныя курсы, былі пасланы на палявыя работы, а ў ясьлі пасылалі старух-інвалідаў. У адным саўгасе Менскага раёну дырэктар аддаў памяшканьне ясель пад кватэру жывёлаводу, а рабочым на гэта не рэагаваў. У саўгасах «Рагінь», Буда-Кашалёўскага раёну і «Вясёлова» — Глускага раёну, работніцы ясель на працягу 2-х месяцаў не атрымлівалі пенсіі. Зусім дрэнна абстаіць справа з забясьпячэньнем ясель прадуктамі. Ясьлі ня ўключаны ў плянавае забясьпячэньне. Многія калгасьніцы не пасылаюць дзяцей у ясьлі, бо дзецям прыходзіцца харчавацца дома.

Такіх фактаў можна прывесьці шмат, яны сьведчаць аб недапушчальных адносінах да паляпшэньня быту жанчын. Партыйныя арганізацыі не ўстанавілі кантролю за выкананьнем дырэктыў аб паляпшэньні бытавых умоў калгасьніц, аб уцягненьні іх у вытворчую працу.

Калгасцэнтр навінен праверыць, як выкананы паказаньні наконт уцягненьня працаздольных жанчын у кампанію ўборкі ўраджаю. Наркамснабу трэба вылучыць поўную колькасьць дэфіцытных прадуктаў для ясель, у першую чаргу для тых, якія знаходзяцца ў саўгасах.

РВК і органы аховы здароўя павінны ўзмацніць нагляд і інструктаваньне ўстаноў ахматпляду. Прафсаюзы і інш. арганізацыі павінны ўзяць пад свой кантроль работу ясель і пляцовак.

Толькі пры гэтых умовах мы забясьпечым поўнае скарыстаньне жанчын ва ўборачнай кампаніі і палепшым бытавыя ўмовы дзяцей калгасьнікаў і рабочых саўгасаў.

Л. Гурэвіч.

Заводзкія ясьлі

Харчовы склад ў... стайні

Адміністрацыя Віцебскай швейнай фабрыкі «Прафінтэрн» ігнаруе ўсе пастановы ўраду і гарсавету аб прадзядзенні ў жыцьцё элементарных аздаравіцельных мерапрыемстваў.

Фабрычнаму ЗРК і сталоўцы стаў патрэбен склад для хаваньня харчовых прадуктаў. Ня гледзячы на тое, што для гэтай мэты можна было прадаставіць вольнае памяшканьне пры самой сталоўцы, адміністрацыя адвяла пад харчсклад... вугал пры стайні.

Санітарны доктар запрапанаваў адміністрацыі даць складу адпаведнае памяшканьне.

Але адміністрацыя фабрыкі «Прафінтэрн» не зьвярнула ўвагі на прапанову сан. доктара, і склад да апошняга часу знаходзіўся ў стайні.

Калі на фабрыку зьявіўся прадстаўнік горсанінспэкцыі для праверкі выкананьня прапановы, дык, нам. дырэктара... вы гнаў яго з габшэту, залвіўшы пры гэтым: «запішы, што я вашай прапановы ня выканаю»

За такія безадказныя адносіны да паляпшэньня бытавых умоў рабочых, неабходна прыцягнуць адміністратара да суровай адказнасьці.

С.

Работнікі хлебапячэньня абавязваюцца адкрыць 51 новы магазын

У Менску адбылася ўсебеларуская нарада па пытаньнях хлебапячэньня. Дэлегаты нарады абясьцілі сябе мабілізаванымі на рэалізацыю майскай адозвы ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу аб перабудове спажыўкаапэрацыі, у прыватнасьці ў галіне хлебапячэньня.

Работнікі хлебапячэньня абавязаліся адкрыць 51 новы магазын і рад ларкоў. Сюды ўваходзіць пабудова да 25-га верасьня 1931 году 5 хлебных магазынаў у Менску, Віцебску, Гомелі, Рэчыцы і Барысаве.

Да 20 жніўня навінна быць разгорнута і арганізавана на ўсіх хлебазаводах выпрацоўка булачна - цукерных вырабаў.

У бліжэйшыя-ж дні навінен быць скончан перавод на гаспадарчы разрахунак усіх булачна - бараначных і цукерных цэхаў.

Для дапамогі хлебазаводам у адкрыцьці новых магазынаў Белпрамхлеб вылучае 4-х чалавек.

Месячнік барацьбы з чаргой праходзіць нездавальняюча. Менскі ЦРК толькі праз тыдзень пасьля абвяшчэньня месячніка пачаў разгортваць работу.

Ня лепшую актыўнасьць праявіла і ЦП саюзу працаўнікоў каапэрацыі і дзяржгандлю. Між тым, саюз у адказ на адозву варашылаўцаў абавязаўся правесьці месячнік па ліквідацыі чаргі ўдарнымі тэмпамі.

Шэф ЦРК—абутновая фабрыка — не дапамагае праводзіць гэту работу. Удзел шэфскай арганізацыі выяўляецца толькі ў тым, што да штабу па барацьбе з чаргой прымацован прадстаўнік рабочых.

Штаб арганізаваў 34 брыгады, уцягнуўшы ў іх каапэрацыйны актыў.

Галінавыя аб'яднаньні Белкаапсаюзу, Белгандлю, ТСТ да гэтага часу ня ўключыліся ў месячнік. Між тым, у магазынах усё яшчэ вялікія чаргі, асабліва ў вячэрні час. Ніякія меры па ліквідацыі чаргі ня прымаюцца.

С.

Каапэрацыя

ЗДАЦЬ ЧАРГІ У АРХІЎ!

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

аб адкрыцьці новых каапэрацыйных магазынаў

Горад	Павінна быць адкрыта ў жніўні	Адкрыта
Менск	72	17
Віцебск . . .	44	23
Гомель	48	15
Бабруйск . . .	27	10
Магілеў . . .	15	7
Ворша	16	5

Тысячы рабочых гадзін трацяць у чарзе

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Дзкаднік агляду перабудовы каапэрацыі ня ўнёс паляпшэньня ў работу барысаўскага ЦРК.

ЦРК павінен быў адкрыць у БАРЫСАВЕ 15 крам і па Бярэзінскім ЗРК — 4, але замест адкрыцьця новых магазынаў некаторыя работнікі ЦРК займаюцца «очковтирательством» і апартуністычнымі разважаньнямі аб мэтазгоднасьці пашырэньня сеткі. БЦРК паведамляе, што ім адкрыта 7 крам. У сапраўднасьці-ж гэтыя крамы даўно існавалі, але яны ціпер распачалі гандляваць гародзінай.

Крамы да гэтага часу не пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Гэтае-ж самае і па лініі аб'яднаньняў Белкаапсаюзу.

Недапушчальна слабое разгортваньне каапэрацыйнай сеткі і адсутнасьць рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў па паляпшэньні тэхнікі гандлю выклікаюць вяпінія чаргі. Рабочым часта прыходзіцца гадзінамі прастойваць у чарзе для таго, каб атрымаць некалькі кілёбульбы. Між тым, у БАРЫСАВЕ бульбы многа і можна было-б паладзіць забесьпячэньне ёю рабочых бяз усякага чаргі.

Гарсавет не аказвае дапамогі ў арганізацыі савецкіх рынкаў. Існаваўшы рынак чамусьці гарсаветам закрыт і перанесен за тры вярсты ад гораду.

Работа барысаўскай каапэрацыі праходзіць без кантролю з боку пралетарскай грамадзкасьці. У выніку ёсьць факты, калі ў крамах няма такіх тавараў, як начыньне, галянтарэя, у той час, як на базе гэтыя тавары ёсьць.

Няма прыкметнага эруху ў пастаноўцы грамадзкага харчаваньня. Выпучная сэкцыя грамадзкага харчаваньня ўсё яшчэ ня можа наладзіць работу сталовак і палепшыць якасьць абедаў.

Мясцовыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі ня прымаюць належных мер, каб дапамагчы спажывецкаапэрацыі сапраўды перабудаваць сваю работу па новаму.

Нэйдлін.

Арганізаваць папярэдняе развважваньне тавараў

ВІЦЕБСК. СТВОРАН штаб З ПРАДСТАЎНІКОЎ ГАРПРАФСАВЕТУ, ЦРК, РЭДАКЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫЯ» І ІНШ. АРГАНІЗАЦЫЙ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З ЧАРГОЙ.

НА ПЕРШЫМ ПАСЯДЖЭНЬНІ ШТАБ НАМЕЦІЎ РАД РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ДЛЯ ПАЛЯПШЭНЬНЯ РАБОТЫ МАГАЗЫНАЎ ЦРК.

У МАГАЗЫНАХ ПА ПРОДАЖЫ МЯСА, ГАРОДНІНЫ, ХЛЕБА, МАЛАКА ГАНДАЛЬ БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА З 7 ГАДЗ. РАНІЦЫ. УСЕ ПРАДУКТОВЫЯ МАГАЗЫНЫ ПРАЦУЮЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА.

ДЛЯ ЛАРКОЎ УСТАНАЎЛЯЮЦЬ ЦЬВЁРДЫЯ ГАДЗІНЫ РАБОТЫ. УСІМ МАГАЗЫНАМ ПРАПАНАВАНА АРГАНІЗАВАЦЬ ПАПЯРЭДНЯЕ РАЗВАЖВАНЬНЕ ТАВАРАЎ. ЗАГАДЧЫКАМ МАГАЗЫНАЎ І АДДЗЯЛЕНЬНЯЎ ДАЗВОЛЕНА ПЕРАВОДЗІЦЬ ПРАДАЎЦОЎ У ВЫПАДКУ ЗАГРУЗКІ З АДНАГО АДДЗЯЛЕНЬНЯ Ў ДРУГОЕ. ПРІСКАЦІЕНЬНІ СПАЖЫЎЦОЎ КАЛЯ КАСЫ ЗАГАДЧЫКІ МАГАЗЫНАЎ ПАВІННЫ АДКРЫВАЦЬ ДАДАТКОВЫЯ МЕСЦЫ ПРЫЁМКІ ГРОШАЙ.

Дзьве лініі

1

Майстар зборачнага цэху — высокі і вапрэтны Белабржэцкі—блізенька прыхіліўся да дашчатай сьцяны канторкі і запаўняе дыяграму. На спутаным тварэ нешк на-асабліваму гараць вочы і мякка ляжыць нерамонная радасьць. Унутранае здавальненьне выліваецца шчасьліваю ўсьмешкаю.

Прамасьлёная рука Белабржэцкага дрыжыць. Яна дрыжыць ад дзённай работы, ад радаснага хваляваньня. Майстар стрымлівае сваю вялікую касьцістую руку і стараецца раўней правесьці лінію — запісьці дзень на гэты вялікі аркуш разлінаванай паперы.

Выструганай палачкай Белабржэцкі праводзіць лінію. Дарожка чырвонага атрамэнту крута ўзьбіраецца ўверх. Яна дайшла да графіку «32» і стала акругленым канцом.

Трыццаць дзьве — гэта 17 чэрвеня. Завод выпусьціў трыццаць дзьве сіласарэзкі, на сем перавыканаў дзённае заданьне і майстар чырвонасьцяжнага цэху запісаў пра гэта ў дыяграму.

Ён адступіўся ў бок і яшчэ доўга глядзіць на незасохлую чырвоную лінію. У яго нават гэта лінія нетаварасьцна ў доўгі жывы паток мацыі, якімі сёньня застаўлен цэх і якія зараз будуцца пад маторы выпрабавальнай станцыі.

Ад работы матораў дрыжаць сьцены. Моцным і прыкметным гулам напоўнен цэх. Майстар чуе гаты гуд пацісьлавых матораў і рука міжвольна ўзьнімаецца ўверх і хоча працягваць яшчэ вышэй чырвоную лінію.

Цэхавы партыйны сакратар і намбэнік майстра Сімховіч затрымаўся на парозе канторкі і сочыць за Белабржэцкім. Сімховіч бачыць радасьць Белабржэцкага і сам плодоен перамагчы аксамітнай усьмешкі. Гэта ўсьмешка—такая цёплая ды іскрыстая — сонечным зайчыкам гуляе на твары Сімховіча і ён дзіка пытае:

— Запісаў?

Белабржэцкі ўстрапянуўся ад нечаканага слова, неяк наіўна-пінавата нагадзеў на свайго памочніка і сказаў:

— Так... Запісаў! Люблю ўзьнімаць лінію ўверх...

Сімховіч і Белабржэцкі разам пакінулі канторку ды моўчкі ідуць па цэху. Ужо больш дзьвёх гадзін пасьля пабаншу. Многія работы ўжо ў парку, на Пралетарскім дуле, у ласкавых водах Сожа. А партыйны сакратар Сімховіч і майстар цэху Белабржэцкі яшчэ на заводзе, яшчэ ў цэху. Яны ідуць і моўчкі пра сабе гавораць аб сёньнішнім дні. Мараць, каб такімі сталі ўсе, каб заўсёды хапала дэталяў на трыццаць машын.

Заўтра Белабржэцкі ідзе ў адпачынак і Сімховіч застанецца майстрам.

Сімховіча ўжо непакоіць заўтрашні дзень і ён злосна глядзіць на зялёную і страшную чарапаху—узнагароду махапічнаму за работу і тэмпы. Чарапаха пазуе зьверху ўніз, і Сімховічу здаецца, што яна вось-вось зьлезе са сьцяны і пагоніе ў яго канторку, ды адгоніць чырвоную лінію назад.

Сімховіч гэтага баіцца і спакойна кажа Белабржэцкаму:

— У цябе заўтра водпуск і ты ідзі дамоў. Я адзін прайду па цэхах і праверу, што будзе заўтра.

Белабржэцкі пакінуў час глядзіць на Сімховіча і замест рукі дае распаряджэньне:

— Ты правярай у махапічным, я зайскочу ў кавальны і ліцейны. Чакаю цябе каля будкі...

2

Мы кожны дзень прыходзім на завод разам з рабочымі. Мы выпучылі ўсе цэхі. Мы ведаем людзей і машыны.

Ліцейны аддзяе рамы, дыскі, махавікі, кранштэйны, розныя шасьцёркі і падпынікі.

Кавальны выгінае бэлькі для рамы ходу, рожа жалеза і сталь, робіць калёсы, нагане абручы на дыскі, кляпае балты.

Механічны ўсё гэта стружа, выточвае, сьвідруе.

Дробна-кацельны рыхтуе барабаны, трубы, карыты, калухі і кажушкі.

На сярэдзіне заводу, у цэнтры яго вялікага двара, стаіць яшчэ адзін цэх—зборачны. Высокі, сьветлы і прасторны цэх. Сюды на электракарах і на маленькіх ручных тачках плывуць часткі і дэталі з усіх цэхаў і чарнавых складаў.

Зборачны—гэта барометр, правёрка работы ўсіх цэхаў. Гэта вялізарная люстра-лупа, праз якую, як на далоні, відны ўсе цэхі і ўвесь завод.

І калі ў ліцейным сёньня быў вялікі брак, і калі механічны надкачаў—паток у зборачным зусім рэдзенькі, праляёт цэху пустае, узбаламошаныя людзі ганяюцца за дэталямі і моўчкі стаіць маторы на выпрабавальнай станцыі.

Гомсельмаш ня здолеў ухіліцца ад так званага нэрыяду пуску і «дзіцячых» хваробаў.

Тысячы нязрыкмепных драбніц. Яны, як дзіцяя кошкі, сьцерагуць завод з розных пабачаных месц рантам на яго нападаюць, грызуць з розных бакоў, надбіраюцца да горла, каб пераграбыці і высмактаць кроў.

Лінкор — самая магутная баявая адзінка ваеннага флёту, больш за ўсё баіцца «маскітаў» — падводных лодак. Калі лінкор праязжае і маскітны флёт апанае яго, — магутнаму і вялізарнаму караблю пагражае сьмяротная небяспека.

Перамогу вырашае манэўр. Калі каман дзір лінкора сваячасова заўважыць «маскітаў» і бяз усякай марудпасьці правядзе неабходны баявы манэўр,—гэтыя страшныя і сьмертаносныя маленькія караблікі—падводкі гублянюць сваю баяздольнасьць і ўцякаюць з усіх сіл.

Так і з новым заводам.

Дырэктар Сельмашу ня вывучыў новай баяздольнай тактыкі. Ён вышаў у вялікае плаваньне са старымі картамі, з набітым компасам, а людзі займаліся не сваёй работай.

Наўвязкі і нявіязачкі, непаладкі вялікія і непаладкі маленькія скубуць цэхі з розных бакоў.

Патрэбны рашучасьць і манэўранасьць. Неабходна зараз-жа паставіць завод на новы рэйс, падаць новую каманду, людзі павінны выконваць новую работу. А дырэктар гэтага ня робіць.

Фалкін стаіў на капітанскім мосьцку і не кіраваў заводам. Ён рэдка бываў у цэхах, яго там ніколі ня бачылі рабочыя. У дырэктарскі кабінет, на другі паверх заводакіраўніцтва ішлі людзі з патрэбаваньнямі, прапановамі, пытаньнямі і ўзьдымам, а выходзілі разьбітымі і незадаволенымі.

— Ну, што-ж я зраблю... Што мы можам... Калі таго няма... Гэта ня прыбыла... А ў тым адмовілі...

Так адказваў Фалкін, пацікаў плячыма ды разводзіў рукамі. «Маскіты» падгрызалі завод, а дырэктар стрымліваў барацьбу, ня вёў людзей адбіваць атаку.

3

У дырэктара была свая апартуністычная лінія і ён па гэтай лініі вёў завод. Фалкін зусім спакойна дакладваў на сходах, што праграма заводу выконваецца толькі напалову і з боку складалася такое ўражаньне, што гэта яго ніколькі не хвалявала.

Токар, дужы загарэлы мужчына, горача крыў дырэктара, выкладаў папыраному пленуму заўкому гару фактаў, паказваў нівнаватых, называў іх прозьвішчы.

Голас токара звычны і роўны, а словы магутныя і пякучыя, як агонь. Яны зьлізваюцца з крывёю і электрычным токам цякуць па чалавечых жылах. Кожнае слова нападае, як снайперская куля.

Сотні рабочых судрыгаюцца ад ганьбы, якая лажыцца на іх завод і якую токар цэлер малюе. Яны з токарам. Гэта іх вуснамі гаворыць токар, гэта гавораць героі працы і яны ўзьнімуць чырвоную лінію дыяграмы. Узьнімуць абавязкова!

Дырэктар сядзіць з краю стала. Пакручвае тоўсты чырвона-сіні алавак у пальцах і глядзіць на дрэвы, на маладую завязь яблыку.

Ці чуе ён? Ці праймаюць яго гэтыя такія простыя і такія горача-балючыя словы токара?

Рабочыя глядзяць на дырэктара і яго поўны спакой пяняе іх, халодным бетонам асядае на сэрцы.

Загадчык вытворчасьці, сагнуўшыся ў абаранак, сядзіць на самай апошняй лаўцы. Ён заўсёды ў сіняй блузе і на сходах і пасяджэньнях заўсёды сядзіць у самым куточку.

Ён пранізваюча глядзіць вам у вочы і нешта думае. Ён заўсёды думае і нават тады, калі ўзьнікае пытаньне і трэба даць на яго вытворчы адказ. Ён інжынэр і мае не малыя веды. Але гэтыя веды яго цупаць, яны ляжаць заскарузлым пластом, адарваліся ад яго работы, ён сваіх ведаў не скарыстоўвае, ён ім не давярае, ён баіцца.

Гэта сакрасьбіны чалавек у футаралы, чэхаўскі Белікаў, які ўважліва выслухоўвае, ківае галавою і ціха кажа: «Оно, конечно, так-то так, все это прекрасно, да как-бы чего не вышло».

Да загадчыка падсядае Філіповіч — старшы на зборцы сячкарняў. Філіповіч адлаў шмат здароўя і часу, пакуль выпусьціў першую машыну. Цэлер ён пытае ў загадчыка вытворчасьці, чаму ўжо трэці дзень не даюць яму шарнірных падпынікаў і калі ўсё-ж такі гэтыя падпынікі пачнуць рабіць.

Загадчык вытворчасьці слухае Філіповіча, глядзіць на дырэктара і моўчыць.

Філіповіч не атрымлівае ніякага адказу і пакідае інжынэра аднаго.

Вакол апартуністычнай лініі сабралася многа абываталяў. Яны запаўняюць графікі ў ТНВ, рыхтуюць нарады ў плянавым, нішуць эмацыянэрныя тэлеграмы ў аддзеле забясьпячэньня. Пішуць і самі-ж у іх на верацць. Для іх тэлеграма — апраўданьне, дакумант таго, што яны «працуюць», што яны «змагаюцца» і «бувяць».

А трэба, каб:

«Нашы гаспадарчыя кіраўнікі кіравалі прадпрыемствамі не «наогул», не «з паветра», а канкрэтна, прадметна, каб яны падыходзілі да кожнага пытаньня ня з пункту погляду агульнай балбатні, а сурова дзелавым чынам, каб яны не абмяжоўваліся паняроваю адпіскаю ці агульнымі фразамі і лозунгамі, а ўваходзілі ў тэхніку справы, уваходзілі ў дэталі справы, удумліяся ў «дробязі», бо з «дробязяй» будуюцца цэлер вялікія справы».

4.

«...Сорак рабочых сталі на адліўку. Аднага была надзвычайная. Стары ліцейшчык Румянцаў, які ўзяўся кіраваць адліўкаю, за адну ноч пасівеў у трывозе за магчымыя ўскладненьні. Была небясьпека, што выступіць з глебы вада і тады сто з лішкам тон вадкага мэталю ўзарваліся-б і маглі прынесьці нязьлічоныя няшчасьці. Жыцьцё сарака чалавек было пастаўлена на карту. Але ні адзін з іх ня адрафіў: яны былі поўны ранучасьці да перамогі—і яны перамаглі.

Калі ў часе адліўкі ў аднаго рабочага, старога нуцілаўца Бызава, загарэўся гарнітур, ён і не падумаў пакідаць пост, хаця і была падрытавана яму падпена. Так змагаюцца рабочыя СССР за незалежнасьць ад капіталістычных краін *)»...

Гэта на Ізарскім заводзе, на пабудове першага савецкага блюмінга. Гэта на адліўцы самай вялікай стацыны блюмінга вагою ў 106 тон.

На сельмашы не адліваюць такіх вялікіх стацын і праца ня абязана з такімі небясьпекамі. Але і на Сельмашы ёсьць багата Румянцевых і Бызавых. Праўда, гомсельмашаўскія Румянцавы і Бызавы не прайшлі школы нуцілаўскіх вагранак. Яны яшчэ маладыя рабочыя і, будуючы завод, змагаючыся за праграму, загартоўваюцца і растуць.

... У вачох застыла вялікая стома. Пяжка пазнаць людзей: учора такія жыцьцярадасныя і вясёлыя, і рухі іх былі такімі пястрымнымі і прадукцыйнымі і так багата вроблена, а сёньня твары такія змучаныя, вочы асапавелыя і скулы розка выступілі і абазначыліся.

Брыгадзір Каган, адмыслова прыпадняўшы ўверх замураны брыль чорнай, як ён сам, кепкі, давіў на зубах нейкую нязлоўленую вялікую зласьць і глядзеў на вялізную сіласарэзку, каля якое, нагнуўшыся, стаіў жэнны рабочы яго брыгады Гурар'еў.

*) І. Шурылін — «Новое лицо промышленности».

ДЗЯМІД БОЙЧЫК

1. Маскіты

Гомсельмаш

Гурар'еў хацеў мёртвае прымусіць жыць. Дэталь не падыходзіла, дзірка коса прасьвідравана, а пра запас такіх дэталяй ня было. Гурар'еў не хацеў стаяць без работы і настойліва ўдуваў жыцьцё ў халодны чыгун.

Усё-ж дэталь не станавілася па сваё месца, дзіркі не супадалі і не пралазіў болт.

Каган узяў дэталь в рук рабочага, аглядзеў яе спрактыкаваным вокам майстра, прыкінуў на руцэ, прыставіў да машыны, а потым рэзуком кінуў у скрынку з бракам і моўчкі адышоў.

Лейкін, брыгадзір другой брыгады на абораным цэху, трымаў у руках нярыгодную канічную шасьцёрку, глядзеў на яе і ніяк ня мог зразумець — якою дарожкаю гэта вось бракованая дэталь, памечаная ім, брыгадзірам Лейкіным, у трэці раз прыходзіць зноў на зборку?

Сімховіч, учапіўшыся пальцамі за гузік Дрыца — начальніка механічнага цэху, дзяблага і рослага дзядзі—пытаецца пра дэталі.

Дрыц выручваецца з рук Сімховіча ды бяжыць па цэху, наварочае да гарызонтальна-сьвідравальнага варыятару і правярае там работу.

Учора сабраны 32 машыны, а сёньня рантам выйшлі самакальныя сьвідры 14-га калібра і механічны зусім не дае дэталяй.

Сёньня будзе толькі 20 сіласарэзак і таму зборшчыкі такія сумныя і злыя. Дыяграму на сьцяне канторкі зборачнага цэху будуць запаўняць сёньня чорнай лініяй і яна рэзка спадае ўніз.

Мы ўжо добра ведаем вузкія месцы сёньняшняга дня, але ўсё-ж пытаем:

— Таварыш Каган, як паток?

— Стаіць...

Каган словам адказвае Каган. Лейкіну падабаецца другое слова і ён яго кажа:

— Зная...

Па цэху закланчана сьпяшаецца Сімховіч. У яго хлопцы пытаюць:

— Як лінія?

— Зьніжаецца... — На-ходу адказвае Сімховіч ды ідзе ў канторку. Людзям трэба стаяць, але яны ня хочуць мець прастояў. Яны хвалююцца і ня ведаюць, што рабіць. Потым гадзін на чатыры ўсім цэхам ідуць дамоў, а пасьля зноў прыходзяць на завод і на-ўдарнаму працуюць, упарта б'юцца за машыны.

Трэба заваляваць машыны. Трэба выкараніць лінію Фалкіна і вывесьці завод з прарыву. Героі працы гэта ведаюць і робяць.

5.

Антоша Купрыянчык, некалькі разы прэміяваны за ўдарную работу, выпрабоўвае сіласарэзку. Матор уключан і Антоша адной рукой падлівае масла ў масьлёнкі, а другая рука ляжыць на падпынніках, правярае ступень іх нагграваньня.

Калі матор ацьпхае і супінаецца палавы дыск, Купрыянчык з малаточкам клацуном абыходзіць сіласарэзку, пастукае на раме, на ходзе і распорках.

Па другім, на глухім стуку рэспаўнка Купрыянчык хворыя мясьцінкі на чугунных частках і тады даўжэй затрымліваецца на іх. У машыне № 367 лопнута рама. Шчыліна маленькая і напрыметнея. Яна таюсенькая цёмна-сіняя лініяй ляжыць на шэрым чыгуне.

Антоша раіцца з старэйшым рабочым па выпрабавальнай станцыі, са сваімі таварышамі Алёшай і Яшкам, якія, як і ён, скончылі прафшколу і на Сельмашы сталі перадавымі рабочымі. Потым ён бярэ крайду і на кажусе машыны пішша: «брак».

З такім бракам стаяць дзьве машыны. У іх аднолькавыя шчыліны і бадай шчыліна на адным і тым-жа месцы рамы.

Дырэктар заводу, загадчык вытворчасьці і начальнік цэху двойчы прыходзілі на выпрабавальную станцыю і патрабавалі, каб забракаваныя машыны былі прапушчаны і прыняты. Яны дказвалі камсамольцам, што сіласарэзкі зусім прыгодныя і што ніякіх страшных няма, калі ёсьць маленькі дэфект у раме.

Камсамольцы даказвалі другое, казалі аб якасьці, аб адказнасьці іх работы, напаміналі скаргі саўгасаў і ня прымалі машын.

Дырэктар злаваў і даваў загад. Тады камсамольцы ішлі на другое. Яны стаялі пранаову, каб дырэктар і загадчык вытворчасьці напісалі пісьмовую гарантыю аб дебразкаласнасьці гэтых машын і пасьля ўжо можна будзе іх прыняць і адправіць.

Ні дырэктар, ні загадчык вытворчасьці такой гарантыі, вядома, ня пісалі, а толькі яшчэ больш злаваў ды пакідалі выпрабавальную станцыю.

Камсамольцы жартавалі і сьмяяліся. А Антоша Купрыянчык казаў:

— Не брат Фалкін, хоць ты і дырэктар, але твая лінія ня пройдзе... Твая лінія ня про-ой-дзе-е!

Гомсельмаш, чэрвень-ліпень.

Выязная брыгада «Зьвязды».

ПРАТЭСТУЕМ!

„... СЫШЧЫКІ І ПАЛІЦЫЯ, ЯК ШАЛЕНЫЯ ШАКАЛЫ, КІДАЛІСЯ НА НАС І БОТАМІ ВЫБІВАЛІ НАМ ЗУБЫ, РАЗЬБІВАЛІ ГАЛОВЫ І, НАРЭШЦЕ, МОКРЫХ, СКАТАВАНЫХ, СКРЫВАУЛЕНЫХ, НАПОУЖЫВЫХ ЗАКАВАЛІ У ЛАНЦУГІ...“

НА АБАРОНУ палітзьняволеных, НА АБАРОНУ!

Год выданьня—XV
№ 225 (4130)
ЧАЦЬВЕР 20 ЖНІЎНЯ 1931
Цена нумара 5 коп.
ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,—сакратар—10-74, партэкзатар—13-80, прамысл.—13-80, сав. замж.—6-19, мясц. інформ.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, начны рэдакт. інфарм.—6-42, міжнародны інфармацыі—10-74, канторавыд-ва—7-81, аддзел абвестак—7-31

ЛІСТ З ПЕРАМЫСКАЙ СЬЛЕДЧАЙ ТУРМЫ

НАКОЛЬКІ ЦЯЖКОЕ ЖЫЦЬЦЁ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ У ЗАСЬЦЕНКАХ БЕЛАПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ СЬВЕДЧЫЦЬ ЛІСТ, ЯКІ МЫ ЗБМЯШЧАЕМ НІЖЭЙ СА СЬЛЕДЧАЙ ПЕРАМЫСКАЙ ТУРМЫ.

«ДА ЛІСТАПАДА 1930 Г. ПРАВЯЛІ МЫ ДЗЬВЕ ГАЛАДОЎКІ—АДНА ПРАЦЯГВАЛАСЯ 9 ДЗЁН, А ДРУГАЯ — 6. ГЭТА БЫЛО ЗМАГАНЬНЕ ЗА ЛЕПШАЕ АБЫХОДЖАНЬНЕ З НАМІ, ЗА ПРАГУЛКУ, ЗА СЯДЗЕНЬНЕ Ў АГУЛЬНЫХ КАМЭРАХ, ЗА ПІСЬМОВЫЯ ПРЫЛАДЫ, КНІЖКІ, ГАЗЭТЫ, —АДНЫМ СЛОВАМ ЗА ПРАВЫ БЫЦЬ ЧАЛАВЕКАМ, ЗА ПРАВЫ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ, ЯКІЯ БЫЛІ ЗДАБЫТЫ ЦЯЖКОЙ БАРАЦЬБОЙ ПАПЯРЭДНІМІ ТАВАРЫШАМІ, А ЗАРАЗ ТУРЭМНАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ ХОЧА ІХ АДАБРАЦЬ.

У ЧАСЕ ПЕРШАЙ ГАЛАДОЎКІ, ПРАКУРОР АБЯЦАЎ НАМ ЗАДАВОЛІЦЬ НАШЫ ПАТРАБАВАНЬНІ, КАЛІ ТОЛЬКІ МЫ СПЫНІМ ГАЛАДОЎКУ, АЛЕ СЛОВА НЯ СТРЫМАЎ І ТОЛЬКІ НЕКАЛЬКІ ТАВАРЫШОЎ ПАСАДЗІЎ У КАМЭРЫ ПАЛІТЫЧНЫХ, А РЭШТУ НАШЫХ ПАТРАБАВАНЬНЯЎ НЯ ВЫКАНАЎ. У ТОЙ ЧАС, НА ДВА ТЫДНІ ПАЗЬНЕЙ, КАЛІ МЫ КАТЭГАРЫЧНА ПАТРАБАВАЛІ АД НАЧАЛЬНІКА ТУРМЫ ПАСАДЗІЦЬ У КАМЭРЫ ПАЛІТЫЧНЫХ ТЫХ ТАВАРЫШОЎ, ЯКІЯ ЯШЧЭ СЯДЗЕЛІ ПАМІЖ КРЫМІНАЛЬНЫМІ, ПРАКУРОР ВЫДАЎ ЗАГАД УСІХ НАС РАССАДЗІЦЬ ПАМІЖ КРЫМІНАЛЬНЫМІ. МЫ ПАТРАБАВАЛІ ДА СЯБЕ ПРАКУРОРА, АЛЕ ЗАМЕСТ ЯГО ЗЬЯВІЛАСЯ ПАЖАРНАЯ КАМАНДА І ПАЧАЛА ЗАЛІВАЦЬ КАМЭРЫ, ВАДОЮ ТАКІМ СПОСАБАМ, ШТО ТАВАРЫШЫ ТРАЦІЛІ ПРЫТОМНАСЬЦЬ І ТАДЫ КІДАЛІСЯ НА НАС П'ЯНЫЯ ТУРЭМНЫЯ НАГЛЯДАЛЬНІКІ І БІЛІ ПРЫКЛАДАМІ, ТАПТАЛІ НАГАМІ ПА ГАЛАВЕ, ГРУДЗЁХ, ЖЫВАТУ, ПЛЯЧОХ, НАГАХ — АДНЫМ СЛОВАМ, ДЗЕ ТОЛЬКІ МОЖНА БЫЛО.

ІНШЫЯ ТАВАРЫШЫ, ДА ЯКІХ НЕ ДАЙШЛА ЧАРГА КАТАВАНЬНЯ, УЗЫНЯЛІ КРЫК ПРАТЭСТУ, ДА ІХ ДАЛУЧЫЛІСЯ НЕКАТОРЫЯ КРЫМІНАЛЬНЫЯ. НА ГЭТА АДМІНІСТРАЦЫЯ АДКАЗАЛА СТРЭЛАМІ, ПАРАНІЎШЫ В. РАСОЎСКАГА Ў НАГУ І ПАЧАЛА ВЫЦЯГВАЦЬ НАС З КАМЭР У ТАК ЗВАНУЮ «КЛЕТКУ», Б'ЮЧЫ ПА ДАРОЗЕ Ў ПРЫСУТНАСЬЦІ САМОГА ПРАКУРОРА.

АЛЕ ЎСЯГО ГЭТАГА ВІДАЦЬ ЯШЧЭ МАЛА БЫЛО ПРАКУРОРУ І НАЧАЛЬНІКУ ТУРМЫ, БО ЯНЫ АДДАЛІ ЗАГАД БРАЦЬ ПА АДНЫМ У «КЛЕТКУ». ТУТ ПАЧАЛОСЯ ЖУДАСНАЕ КАТАВАНЬНЕ. БІЛІ ЖАЛЕЗНЫМІ МАЛАТКАМІ, ЖАЛЕЗНЫМІ ПРУТАМІ, ПРЫКЛАДАМІ, ТАПТАЛІ БОТАМІ, НАКІРОЎВАЮЧЫ ЎДАРЫ СПЭЦЫЯЛЬНА Ў ПАЛАВЫЯ ОРГАНЫ. ТЫХ, ШТО ТРАЦІЛІ ПРЫТОМНАСЬЦЬ, ТУРЭМНЫЯ НАГЛЯДАЛЬНІКІ БРАЛІ ЗА НОГІ І ТАК ГАЛАВОЙ ПА ЗЯМЛІ ЦЯГНУЛІ І КІДАЛІ Ў ВАННУ З БРУДНАЙ ВАДОЙ, КАБ ПРЫВЕСЬЦІ Ў ПРЫТОМНАСЬЦЬ І ПОТЫМ ПРАЦЯГВАЛІ КАТАВАНЬНЕ І ЗЬДЗЕКІ НАД НАМІ ДАЛЕЙ. У ЧАСЕ ГЭТАГА КАТАВАНЬНЯ АСАБЛІВА АДЗНАЧЫЛІСЯ СЫШЧЫКІ І ПАЛІЦЫЯ. ЯНЫ ПАТРАБАВАЛІ АД КАТАВАНЫХ, КАБ МАЛІЛІСЯ БОГУ, КАБ КРЫЧАЛІ «НЯХАЙ ЖЫВЕ ПІЛСУДЗКІ», «НЯХАЙ ЖЫВЕ ПАЛІЦЫЯ», А КАЛІ НАПОЎЖЫВЫЯ ТАВАРЫШЫ КАТЭГАРЫЧНА АДМОВІЛІСЯ АД ГЭТАГА, ТАДЫ СЫШЧЫКІ І ПАЛІЦЫЯ, ЯК ШАЛЕНЫЯ ШАКАЛЫ, КІДАЛІСЯ НА НАС З БОТАМІ, ВЫБІВАЛІ НАМ ЗУБЫ, РАЗЬБІВАЛІ ГАЛОВЫ І, НАРЭШЦЕ, МОКРЫХ, СКАТАВАНЫХ, АКРЫВАЎЛЕНЫХ, НАПОЎЖЫВЫХ ЗАКАВАЛІ Ў ЛАНЦУГІ, ПРЫКОЎВАЮЧЫ АДНУ РУКУ ДА НОГ.

НА ГЭТЫЯ КАТАВАНЬНІ МЫ ЗАПРАТЭСТАВАЛІ, АБВЯСЬЦЮЧЫ ГАЛАДОЎКУ, ЯКАЯ ПРАЦЯГВАЛАСЯ 9 ДЗЁН. З ПРЫЧЫНЫ ТАГО, ШТО ГАЛАДОЎКА НЯ БЫЛА АРГАНІЗАВАНА, І СКАТАВАНЫЯ ТАВАРЫШЫ НЕ МАГЛІ ГАЛАДАЦЬ, А НА СВАБОДЗЕ З БОКУ РАБОЧЫХ І ПРАЦОЎНЫХ МАС НЯ БЫЛО НІЯКАГА ПАДТРЫМАНЬНЯ, МЫ ГАЛАДОЎКУ ПРАЙГРАЛІ. ПАСЬЛЯ ГАЛАДОЎКІ НА ПРАЦЯГУ МЕСЯЦА ТУРЭМНАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ І ПРАКУРОР НЕ ДАПУСЬЦІЛІ ДА НАС НІ ДОКТАРА, НІ НАШЫХ СВАЯКОЎ, ЧАКАЮЧЫ ПАКУЛЬ СЬЛЯДЫ КАТАВАНЬНЯЎ НЕ ЗАЖЫВУЦЬ.

ХОЦЬ ТУРЭМНЫ ДОКТАР І КАНСТАТАВАЎ, ШТО ЎСЕ МЫ БЫЛІ ЗБІТЫ І ПАРАНЕНЫ, СУД НЕ ПРЫЦЯГНУЎ ДА АДКАЗНАСЬЦІ НАШЫХ КАТАЎ, АЛЕ СФАБРЫКАВАЎ НАМ СПРАВУ ЗА БУНТ І ПУБЛІЧНЫ ГВАЛТ. У ГЭТЫМ НІЧОГА ДЗІЎНАГА НЯМА, БО САМ ПРАКУРОР ПРОХАЦЬКА ВЫДАЎ ЗАГАД І ПРЫСУТНІЧАЎ ПРЫ НАШЫМ КАТАВАНЬНІ, НАЧАЛЬНІК ТУРМЫ КОРАБ СТРАЛЯЎ У НАС І ЁН ПАРАНІЎ Т. Т. РАСОЎСКАГА І ГАТКОЎСКАГА, І ХТО-Ж ІХ МОЖА АДДАЦЬ ПАД СУД, КАЛІ ПРАКУРОР ПРОХАЦЬКА САМ КАЖА БІЦЬ І САМ ВЯДЗЕ СЬЛЕДЗТВА Ў ГЭТАЙ СПРАВЕ.

АСАБЛІВЫМ ЗЬВЕРСТВАМ АДЗНАЧАЛІСЯ Ў ЧАСЕ КАТАВАНЬНЯЎ ГЭТА СЫШЧЫКІ — ПАЙКЕР, ФАЙФЭР, КАВЕНЬСКІ І НАГЛЯДАЛЬНІКІ РАДАХОНСКІ, КУРЧВАЙ, ПЯСЭЧНЫ, ЗАВАДЗКІ, ВІШЬНСКІ, БІЛЯН І ІНШ., ПРОЗЬВІШЧЫ ПАЛІЦЭЙСКІХ НЯ ВЕДАЕМ. СТРАШЭННА СКАТАВАНЫ БЫЛІ ТАВАРЫШЫ: ЛЕВАНДОЎСКІ, САНОЦКІ, ЭЙСБРУХ, КІБРЫК, ПАРЫПА, РАСОЎСКІ, ГАТКОЎСКІ, МЭНДА, ДЫМКО, КРАВЕЦКІ, КОНЮХ, КАМАНЮК, КУНАНЕЦ, НОВАК, ДЭПЯЦЮХ, НЕМЕЦ А., ФУКС І ІНШЫЯ. АД ЧАСУ ЗАДУШЭНЬНЯ ГАЛАДОЎКІ ЖЫВЕМ ЯШЧЭ Ў ГОРШЫХ УМОВАХ. ТУРЭМНАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ АДБІРАЕ АД НАС ЗУСІМ ПРАВЫ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ, РАССАДЗІЛІ НАС ПА ЎСЁЙ ТУРМЕ. НЯ ХОЧУЦЬ ПРЫЗНАВАЦЬ ХАРЧОВАЙ КАМУНЫ, НЕ ДАЮЦЬ СЬВЯТЛА, ПАТРАБУЮЦЬ СТАНАВІЦЦА РАНА І ЎВЕЧАРЫ Ў ЧАСЕ ПРАВЕРКІ І ПРЫ ЎВАХОДЗЕ КАГО-НЕБУДЗЬ З ТУРЭМНАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ РАПАРТАВАЦЬ І КРЫЧАЦЬ ХОРАМ: «ЧОЛАМ ПАНЕ НАЧАЛЬНІКУ» (КЛАНЯЕМСЯ НІЗКА ПАН НАЧАЛЬНІК). НА ПРАГУЛЦЫ ПРЫМУШАЮЦЬ ХАДЗІЦЬ НАС ПА АДНЫМ, НА 5 КРОКАЎ АДЗІН АД АДНАГО, ПРАГУЛКА ПРАЦЯГВАЕЦЦА 20-30 ХВІЛІН МАКСЫМУМ. ЗА САМЫЯ НЯЗНАЧНЫЯ ПАРУШЭНЬНІ ТАК ЗВАНАЯ ТУРЭМНАГА РАСПАРАДКУ, ТУРЭМНЫЯ КАТЫ ЗАСТАСОЎВАЮЦЬ РОЗНЫЯ КАРЫ. УБОРНУЮ ЗАМЯНЯЮЦЬ ПАРАШЫ Ў КАМЭРЫ, ТАМУ ПАВЕТРА Ў КАМЭРЫ СТРАШЭННА ЦЯЖКОЕ. ВОКНЫ МАЛЫЯ, УДЗЕНЬ МАЛА СЬВЯТЛА І ПАВЕТРА, ТАМУ ЎСЕ МЫ ХВАРЭЕМ НА ВОЧЫ І ЛЁГКІЯ.

НАША СУЧАСНАЕ СТАНОВІШЧА ПРЫМУШАЕ НАС ВЫСТУПІЦЬ З НОВАЙ БАРАЦЬБОЙ ЗА ЛЕПШЫЯ ЎМОВЫ ЖЫЦЬЦЯ, ЗА ЛЕПШАЕ АБЫХОДЖАНЬНЕ З НАМІ.

ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫЯ СЬЛЕДЧАЙ ТУРМЫ Ў ПЕРАМЫШЛІ.

ГНЕЎ МІЛЬЕНАЎ

На нябачаныя зьдзекі польскага фашызму над тысячамі палітзьняволеных, кінутых у жудасныя казэматы катаржных турмаў, мільёны пралетараў і працоўных БССР адказваюць усё ўзрастаючай хваляй пратэстаў.

Калектыў работнікаў Дзяржпляну БССР, заслухаўшы інфармацыю т. Бурсэйча аб новым наступленьні на палітзьняволеных у турмах фашысцкай Польшчы, аднагадосна пастанавіў.

— Усе як адзін пратэстуем супроць інквізытарскіх катаваньняў над лепшымі братамі. У адказ на новыя зьдзекі ўступаем у рады МОПР'у. На падтрыманьне палітзьняволеных і іх сем'яў уносім 500 руб. І выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу калектывы ЦВК, СНК і НКФ.

Няхай ведаюць палітзьняволеныя фашысцкіх засьценкаў Польшчы, што яны ў сваёй барацьбе не адны, што з імі мільёны.

* * *

Агульны сход супрацоўнікаў Лесбелу па дакладзе аб фашысцкім тэроры выносіць рэзкі пратэст супроць сярэднявяковых зьдзекаў і забойстваў у турмах лепшых сыноў рабочай клясы і працоўнага сялянства.

Мы заклікаем — гаворыцца ў рэзалюцыі — усіх працоўных Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, не пакладаючы рук весьці барацьбу з фашысцкай дыктатурай Пілсудзкага. Мы заяўляем, што ў гэтай барацьбе працоўныя масы Польшчы — не адны, з імі змагаюцца мільёны рабочых і сялян Савецкага Саюзу, якія пільна сочаць за барацьбой сваіх братоў. Мы з яшчэ большай энэргіяй возьмемся за выкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

У дапамогу ахвярам польскага фашызму работнікі Лесбелу пастанавілі адлічыць 2 проц. ад месячнай зарплаты і выклікаюць калектыў ВСНГБ пасьледаваць іх прыкладу.

* * *

Агульна-заводзкі мітынг рабочых, тэхнэрсаналу і служачых ВРЗ «Полымя рэвалюцыі» ў сваёй рэзалюцыі в абурэньнем пратэстуе супроць зьверскіх катаваньняў фашысцкімі катамі палітзьняволеных — гэтых лепшых прадстаўнікоў рэвалюцыйнага авангарду рабочае клясы і працоўнага сялянства.

У адказ на бела-фашысцкі тэрор, агульны сход абяцае з вялікай большай энэргіяй змагацца за выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, узмацняючы гэтым абароназдольнасьць Савецкай краіны, яшчэ шчыльней згуртаваць свае рады вакол бальшавіцкай партыі і яе ленінскага ЦК.

Агульны сход пастанаўляе ўнесьці ў фонд дапамогі палітзьняволеных 1 проц. месячнага заработку. Рабочыя заклікаюць геройных змагароў за польскі Кастрычнік яшчэ больш узмацніць барацьбу з крывавай дыктатурай фашызму.

* * *

Чырвоныя настаўнікі — выпускнікі аднагадовых і 6-месячных пэдкурсаў пры Лепельскім Вялікадзтэхнікуме, заслухаўшы паведамленьне аб зьверскай орэгіі фашысцкіх катаў у адносінах да тысяч палітзьняволеных, кінутых у засьценкі катаржных турмаў, з абурэньнем адзначаюць польскі фашызм праводзіць шалёнае наступленьне на нарвы палітзьняволеных, як і на ўсю рабочую клясу, узброенага нападу на СССР — бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту з мэтай падрыхтоўкі спакойных тылоў.

Чырвоныя настаўнікі, пратэстуючы супроць белапанскага тэрору, даюць абяцаньне, разьвіваўшыся на работу ў калгасы і саўгасы, правесьці шырокую работу на арганізацыі лічэк МОПР'у па прадвядзеньні аберу дапамогі палонькам капіталу, узмацняючы адначасова барацьбу за бальшавіцкае правядзеньне асеньняй пасеўнай кампаніі.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

СЯЛЯНСКІЯ ГАСПАДАРКІ ПРАДАЮЦЦА З ТАРГОЎ

Рэвалюцыйнае выступленьне сялян Зах. Беларусі супроць прымусовай працы, супроць фашысцкага зямляўпарадкаваньня

ВІЛЬНЯ, 17. (БЕЛТА). У вёсцы ПРЫБОРАВА ўсе сяляне атрымалі загад аб прыняцьці ўдзелу ў шарваркавых работах (прымусовая праца пры будаўніцтве ваенна-стратэгічных дарог). Палова вёскі нагуп не прыняла загаду. Але і тыя, якія прынялі загад, адкрыта заявілі, што ня пойдуць на шарваркі.

У вёсках Ганна, Сянчукі і Кузаўка (Дамашэўскага павету, Віленшчына) адбываецца мэлірацыя. Праз некалькі дзён пасьля печатку працы рэвалюцыйныя сяляне скінулі мусоўку, дзе раступмачылі, што ў выніку мэлірацыі яны страцяць сенажаці, пашу і што мэлірацыя мае ваенна-стратэгічны характар. Сяляне пакінулі работы і выбралі забастовачны камітэт.

На дарозе паміж Янавым, Воўчыным і Высока-Літоўскам (Бярасьцейскі павет, Палескае ваяводзтва) — адбываюцца шарваркі. Першай ня вышла на работу, ня гледзячы на трохразовыя пісьмовыя загады і пагрозы штрафам і пакараньнямі — ВЁСКА ЗАЛЕСЬСЕ. На тэлеграфных дротах і слупох былі разьвешаны 25 сьцягаў з пёзунгамі супроць шарваркаў. Пасьля гэтага ні адна вёска ня выйшла на работу. У сувязі з гэтым У ПАВЕЦЕ АРЫШТАВАНА 29 СЯЛЯН, з яніх трое выпушчаны. Але байкот шарваркаў працягваецца.

У адным з вёсак Докшыцкага павету (Віленшчына, на мяжы з Савецкай Беларусьсю) зьявіўся сэквэстратар (чыноўнік, які спаганяе падаткі з сялян) з паліцыянтам, прабуючы адабраць карову ў аднаго з сялян. Селянін аказаў рашучы адпор і запёр карову ў хлеў. Калі сэквэстратар заклікаў у дапамогу яшчэ аднаго паліцэйскага, гэты селянін разам з сям'ёй і іншымі сялянамі, узброенымі нажамі, прагналі паліцэйскіх.

Вёска Вялікае Сяло (Маладэчанскага павету, на мяжы з БССР) яшчэ не заплаціла падаткаў за 1930 год. УСЯ ВЁСКА АДМОВІЛАСЯ ПЛАЦІЦЬ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ. Сэквэстратары, якія былі прысланы сюды, прымушаны былі пайсьці з нічым.

* * *

ВІЛЬНЯ, 16. (БЕЛТА). У вёсках КАМАРОЎКА, ПРЫБОРАВА, СЕЛЯЦКІ, АДХОВА (Владарскага павету, Навагрудзкага) выстаўлены на ліцытацыю (продаж з публічных таргоў) усе да апошняй сялянскія гаспадаркі.

Бесспрацоўныя замяняюць коняй

ВАРШАВА, 19. Садыял-фашысцкі «Роботнік» падае пастыдны факт, які кідае характэрнае сьвятло на тую галечу, што панае сярод соцень тысяч беспрацоўных.

У Шляхце, Старагрудзкага павету, дзе будуецца чыгунка Быдгошч — Гдыня, адзін з майстраў наняў 7 рабочых і некалькі фурманак з коньмі для перавозкі зямлі.

Беспрацоўныя, якія даведаліся аб гэтым, запатрабавалі, каб коняй пры перавозцы зямлі замянілі беспрацоўнымі. Фірма на гэта ахвотна згадзілася, бо перавозка зямлі выключна сілаю беспрацоўных абыдзецца шмат таней, чым пры перавозцы коньмі.

Расьце забастовачная хваля

ВАРШАВА, 19. У Станіславове (Зах. Украіна) ужо на працягу двох тыдняў адбываецца агульная забастоўка шаўцоў, якая распачалася з прычыны зрыву прадпрыемцамі калдагавору і павялічэньня да 12 гадзін часу працы.

На агульным сходзе рабочыя выбралі забастовачны камітэт. На дапамогу эксплёататарам прышла паліцыя, якая арыштавала ўвесь забастовачны камітэт. У адказ на гэта рабочыя выбралі новы камітэт, пастанавіўшы весьці барацьбу да поўнай перамогі.

Жорсткая расправа фашысцкіх катаў

ВАРШАВА, 19. 16 жніўня ў акруговым судзе ў Грудзёнзы адбыўся вялікі палітычны працэс супроць 18 членаў ППС-лявіцы, якія абвінавачваліся ў антыдзяржаўнай дзейнасьці.

Вясною бягучага году польскі фашызм пачаў разгром адзінай у Польшчы легальнай рабочай арганізацыі—ППС-лявіцы, якая сапраўды змагалася з капіталістамі за інтарэсы рабочай клясы. На загадзе фашысцкага ўраду ўсе аддзяленьні гэтай арганізацыі па ўсіх гарадох Польшчы былі закрыты. Адначасова охранка правяла шматлікія арышты, у выніку яніх некалькі соцень рабочых апынуліся за турэмнымі сьценамі.

Фашысцкі суд, праслухаўшы цэлы рад сведак, якія складаліся выключна са шпікоў і паліцэйскіх, прысудзіў С. Росэнка на 7 год катаргі, 8 падсудных — па 5 з паловай год, 7 — па 5 год і 1 — на 2 гады катаргі. Такім чынам, 17 асоб былі засуджаны на 88 год катаржнай турмы.

Лёс выдатных вучоных у буржуазным грамадзтве

БЭРЛІН. Паводле паведамленьня «Бэрлінэр Тагеблат», вядомы спэцыяліст па хваробах вуха, горла і носа 68-гадовы прафэсар Мэер атруціўся разам з сваёй 59 гадовай жонкай. Самагубства прафэсара Мэера тлумачаць яго цяжкім матар'яльным становішчам. Мэер меў ранейшай практы, аднак, апошні час лік яго пацыэнтаў усё больш і больш скарачаўся.

З-ЗА ТУРЭМНЫХ КРАТ ГОРАДНІ

7 жніўня ў катаржнай турме ў Горадні выбухнула галадоўка. Галадае 150 палітзьняволеных. 11 дзён працягваецца жудасная трагэдыя людзей, адданых у рукі ашалелых садыстаў — турэмных катаў. Уся фашысцкая і сатурэмных катаў. Уся фашысцкая і цыяль-фашысцкая прэса, атрымаўшы адпаведны загад «зьверху», захоўвае матыльнае маўчаньне. А 150 людзей, кінутыя ў каменныя мяшкі вастрогу, акружаныя зграяй турэмнай адміністрацыі, якая мае ўсё паўнамоцтвы над жыцьцём і сьмерцю сваіх безабаронных палонькаў, — з ячэўваным гераізмам працягваюць змаганьне.

Якія-ж былі ўмовы, што кінулі палітзьняволеных у распачлівую пяроўную барацьбу супроць ня ўмерна мацнейшага ворага?

Польскі фашызм, імкнучыся фізычна і маральна зьнішчыць рэвалюцыйны авангард рабочай клясы і працоўнага сялянства, пачаў праводзіць у жыцьцё па ўсіх вастрогах паліцэйска-дэфэнзыўны турэмны рэгламант. Рэгламант гэты кідаў палітзьняволеных у такія жахлівыя ўмовы, што здаровы фізычна чалавек без дапамогі з боку не пражыў бы паўгоду, не гаворачы ўжо аб маральнай дэградацыі.

Але ўвесьці адразу гэты рэгламант сярод 10 тысяч палітзьняволеных нават фашызм, які распараджаецца магутным паліцэйска-дэфэнзыўным апаратам, палі чыў немагчымым. Таму міністэрства юстыцыі загадала турэмнай адміністрацыі разьбіць спачатку найманейшыя крапасьці палітзьняволеных — Лукішкі, Горадня, Вронкі, Беласток і інш., якія маюць вялікі вопыт змаганьня за правы палітзьняволеных. Пасьля гэтага галадоўка за галадоўкай выбухаюць па ўсіх турмах фашысцкай Польшчы. Павяк, Вронкі, Перамышль, Пінск, Лукішкі — вось доўгі ланцуг крывавых расправаў польскага фашызму. У Гарадзенскую турму, загадзя, для падрыхтоўкі барацьбы, турэмны дэпартамант прыслаў начальніка Грабоўскага, вядомага сваёй крывавай рэпутацыяй садыста: у Седлецах ён ўласнаручна забіў 2-х палітзьняволеных. Яго кіраўніцтва ў правядзеньні турэмнага рэгламанту ў Гарадзенскім вастрозе абяцала перамогу. Распачалася зацятая барацьба. Праз нядоўгі час, бо ў канцы лютага выбухнула галадоўка, турэмная адміністрацыя сумесна з выкліканай паліцыяй рабіла ўсе намаганьні, каб яе зламаць. На дварэ было пастаўлена некалькі кулямётаў, усе карцэры напоўнілі вадой; у іх кідалі зьбітых напоўжывых зьняволеных. Але нічога не дапамагала. Ніякія катаваньні не маглі зламаць рэвалюцыйнай волі змагароў. І калі турэмныя каты выпусьцілі 2 трупы закатаваных таварышоў, яшчэ мацней згуртаваліся рады тых, якія засталіся жывымі.

Бачачы гэту геройскую рашучасьць змагацца да перамогі або загінуць, адміністрацыя стыміла расправу. Першая атака была адбіта. Частка палітзьняволеных найбольш пакалечаных апынулася ў турэмным шпіталі.

Прайшло некалькі дзён, і начальнік Грабоўскі зноў пачаў падрыхтоўку да новага наступленьня. Паступова, на дробязях, ён пачаў уводзіць новы турэмны рэгламант. З пачатку зьменшыў на паўгадзіны на 20 хвілін, а потым на 15 спатканьні з сваякамі. Праз тыдзень спатканьні магчыма было атрымаць толькі цераз турэмныя краты, як атрымліваюць крымінальныя злачынцы. Яшчэ месяц і начальнік абвясьціў скарачэньне прагулкі на адну гадзіну. Пазбаўленьне гадзіны прагулкі гэта страшэнны ўдар на здароўе палітзьняволеных, асабліва на ўмовах Гарадзенскай турмы, дзе ў невялікіх, бяг услкай вэнтыляцыі камерах сядзіць па 25-30 чалавек, з якіх больш як трэцяя частка хварэе на сухоты.

Але гэтага мала. Па загаду пракурора ў палітзьняволеных адбіраецца сьнідзінка. Дазволена толькі літаратура фашысцкага накраму і рэлігійнага зьместу. Газэты забаронены ўсе. Пасьля гэтага адміністрацыя пачала наступленьне на матар'яльнае становішча палітзьняволеных. Харчовая камуна была ліквідавана. Пры выхадзе на прагулку турэмныя наглядальнікі распачалі рабіць асабістыя вобыскі, каб не дазволіць палітзьняволеным перадаваць адзін аднаму харчы, турэмны паёк і без таго зусім галодны быў зьменшаны амаль на палову. Порцыя хлеба абрэзана з 400 грам на 300. За гэтым пасыпаліся бязупынныя прасьледаваньні. Без услкага поваду амаль кожны дзень хто-небудзь з палітзьняволеных наглядальнікі кідалі ў карцэр. Кожны інспэктар за найменшую дробязь масава пазбаўляў харчовых пасылак з волі, або спатканьняў. Становішча зрабілася зусім немагчымым і палітзьняволеныя былі прымушаны ўзяцца за апошнюю зброю — галадоўку.

Галадоўка адразу набыла надзвычай бурны характар. Уся турма запоўнена паліцыяй і ахраньнікамі, на турэмных вышках пастаўлены кулямёты. Патрулі конной паліцыі кружаць вакол турмы, разганяючы натоўп дэманструючых рабочых, якія пад турэмныя сьцены приходзяць дэманстраваць супроць новага злачынства азьвяроўшых фашыстаў.

Барацьба вядзецца не на жыцьцё, а на сьмерць. Ня гледзячы на барбарскія, сярэдневяковыя мэтады катаваньняў, палітзьняволеныя трымаюцца стойка.

А.

ДА АДКАЗУ

«Чырвоная Зьмена» ад 3-га студзеня 1931 году ў заметцы пад загалоўкам «Пад прамяньнямі юліцэраў» выступіла на абарону маладога рабочага МОТКІ ХАНІНА, якога на працягу некалькіх год эксплёатавалі і цкавалі ў Белдзяржкіно. «Чырвоная Зьмена» прыводзіла рад ганебных фактаў эксплёатацыі тав. Ханіна з боку некаторых працаўнікоў БДК. Гэтая эксплёатацыя праводзілася на вачох усіх арганізацый Белдзяржкіно.

У асноўным яна зводзілася да таго, што тав. Ханіна, на працягу доўгіх год ня вучылі працаваць, скарыстоўвалі не па прызначэньні, —пасылалі на чыгунку купляць білеты купляць кіно-акцёрам абеды, наймаць рамізнікаў, прымушалі прыбіраць кіно, цягаць краслы і г. д. За ўсё гэта ў лепшым выпадку яму плацілі грошы, а то і зусім не плацілі. Напрыклад, за кастрычнік і лістапад 1927 году тав. Ханін нічога не атрымаў, а за сьнежань таго-ж году яму выдалі 2 р. 99 кап.. Пачынаючы з студзеня па верасень 1928 г. Ханіну зусім нічога не плацілі, а ў кастрычніку таго-ж году яму выплацілі... 2р. 50. кап.

«Чырвоная Зьмена» ў той жа час патрабавала тэрміновага расьсьледваньня гэтых абураючых фактаў і прыцягненьня да суровай адказнасьці вінаватых, але справа на гэтым ня скончылася.

Замест сапраўднага рэагаваньня на сыгналы «Чырвонай Зьмены» ў №100 ад 4 мая 1931 г., мы чытаем, што «пасьля зьмяшчэньня ў газэце допісу адміністрацыя БДК амаль на заўтра-ж зьмяніла тав. Ханіна з працы памочніка кіно-асьвятліцеля і пераводзіць на працу чорнарабочага з акладам пэнсыі ў 49 рубл.» А праз некаторы час, пасьля таго, як Ханін скончыў работу з экспэдыцыяй Ленінградзкай фабрыкі Белдзяржкіно ў якасьці асьвятліцеля, кіраўніцтва БДК, у асобе Матусава выносіць загад... «зьняць Ханіна з працы за прагул»(!?). Такім чынам тав. Ханін пасьля 10 год працы быў выкінут на вуліцу. Гэта быў першы крок «рэагаваньня» кіраўнікоў Белдзяржкіно на сыгналы «Чырвонай Зьмены».

Але «Чырвоная Зьмена» на гэтым ня спынілася. У другі раз яна патрабуе спыніць ганебную справу Ханіна, безадкладна яго адназіць на работу ў якасьці намесьніка асьвятліцеля з аплатай за ўвесь прагул, дапушчаны па віне кіраўніцтва Белдзяржкіно. Аднак, як відаць, кіраўніком Белдзяржкіно, няма ніякай справы да таго, што друк сігналізуе, патрабуе і г. д.

Трэба адзначыць, што ў гэтай справе ганебную ролю адыграў і ЦП Саюзу Працаўнікоў мастацтва, які за ўвесь час гэтай справы (2 гады) ня стаў на абарону рабочага. Больш таго, ЦП саюзу нават пашло на дапамогу галавацяпам і заштампавала «мудрую» пастанову бюракратаў Белдзяржкіно.

«Чырвоная Зьмена» ад 19 чэрвеня г.г. зьвярнулася да пракуратуры і РСІ, каб апошнія навучылі бюракратаў рэагаваць на сыгналы друку, настойліва прасіла ў тэрміновым парадку зняцца гэтай агідной справай. Усе матар'ялы былі накіраваны Менскаму гарпракурору. Здавалася-б, што ўсё ўжо скончана. Пракуратура ў парадку нагляду прымусіла безадкладна прыняць тав. Ханіна на работу і прыцягнуць винаватых да крымінальнай адказнасьці.

Але на жаль гэта справа цягнецца і па сёньняшні дзень. Пракуратура, атрымаўшы матар'ялы ад «Чырвонай Зьмены», даручыла начальніку 1-га аддзяленьня міліцыі зрабіць допыт, апошні гэту справу даручыў інспэктару тав. КАЦУ, а тав. КАЦ... паехаў на курорт.

Калі ж гэта справа будзе скончана? Колькі раз яшчэ прыдзецца хадзіць тав. Ханіну?

Тав. Ханін 8-га жніўня прышоў з чарговага 3-х месячнага збору. Ён штодзённа абівае парогі Белдзяржкіно, каб яго прынялі на работу. А «пераможцы» і па сёньняшні дзень зьдзекваюцца ў яшчэ большай цынічнай форме над тав. Ханіным. Напрыклад, на яго запытаньне, калі будзе разгледжана заява, якую ён падаў—старшыня мясцкому Бродзкі адказвае «ідзі працаваць на завод», а дырэктар БДК, Галкін даходзіць да таго, што пасылае тав. Ханіна... паступаць у дзяржаўны інстытут кінематаграфіі.

Мы пічым, што сыгналы «Чырвонай Зьмены», якая зусім правільна стала на абарону зацкаванага рабочага, павінны быць пачуты. Органы РСІ і пракуратура павінны безадкладна ,не чакаючы скарачэньня следзтва і суда, адназіць тав. Ханіна на рабоце ў якасьці памочніка асьвятліцеля.

Канкрэтныя вінаватыя ў гэтай агідной справе павінны быць у тэрміновым парадку прыцягнуты да суровай крымінальнай адказнасьці.

За вымушаны прагул тав. Ханіну павінна быць поўнасьцю кампэнсавана, але ня з кішэні дзяржавы, а з кішэні канкрэтных вінаватых, якія зацягнулі гэту агідней шую справу.

Н. ГАФТ.

АД РЭДАКЦЫІ: Спадзяемся, што нам прыходзіцца АПОШН